© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 38-ы
№ 22 (2291)
18 сакавіка 1969 г.
АЎТОРАК
Цана 4 нап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

КАБ МАЦНЕЛА ТВОРЧАЯ САДРУЖНАСЦЬ

7 лютага ў газеце «Мінская праўда» быў змешчан Зварот калектываў мінскіх трактарнага і аўтамабільнага, Маладзечанскага станкабудаўнічага заводаў, хлебазаводаў калгаса «Нёман» Уздзенскага раёна да дзеячаў літаратуры і мастацтва Мінска і Мінскай вобласці. У Звароце гаварылася аб далейшым умацаванні традыцыйнай садружнасці працоўных з работнікамі культуры, аб правядзенні сумесных вечароў, канферэнцый чытачоў, аглядаў твораў літаратуры і мастацтва. Такая сувязь творчых калектываў з працаўнікамі горада і вёскі адпавядае духоўным запатрабаванням мас, дапамагае майстрам культуры паўней адлюстроўваць жыццё нашага сучасніка.

Бюро Мінскага абкома КПБ адобрыла ініцыятыву калектываў прамысловых прадпрыемстваў і хлебазаводаў і абавязала партыйныя арганізацыі творчых саюзаў тэатраў, канцэртных калектываў, установ культуры перагледзець свае планы шэфскай работы і ўключыць у іх мерапрыемствы па далейшым умацаванні сацыялістычнай садружнасці з рабочымі прадпрыемстваў, будоўляў, хлебазаводаў калгасаў і саўгасаў вобласці. Гаркомы, райкомы партыі, первічныя партыйныя арганізацыі, аблпрафсавет, абком ЛКСМБ, управленні культуры аблвыканкома і Мінскага гарвыканкома, раённыя і гарадскія аддзелы культуры павінны ўсямерна садзейнічаць далейшаму ўмацаванню садружнасці работнікаў культуры з рабочымі, калгаснікамі, часцей праводзіць сустрэчы дзеячаў літаратуры і мастацтва з працоўнымі, арганізоўваць канферэнцыі чытачоў, наладжваць абмеркаванне спектакляў, твораў літаратуры і мастацтва і г. д.

ЗА НОВЫ РОСКВІТ РАДЗІМЫ

Гэты здымак зроблены на выбарчым участку № 14, які размясціўся ў Мінскім Палацы культуры прафсаюзаў. Галасуюць выкладчыца Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Ларыса Шымановіч і інжынер «Белпрампраекта» Яўген Шымановіч.

Фота Ул. КРУКА.

У нядзелю, 16 сакавіка, раней звычайнага прачнуліся гарады і вёскі. У нашай рэспубліцы, як і па ўсёй краіне, у гэты дзень адбыліся выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных.

У 6 гадзін раніцы, калі бой Крамлёўскіх курантаў абвясціў пачатак новага дня, гасцінна расчыніліся дзверы больш чым шасці тысяч выбарчых участкаў — у Мінску, Магілёве, Гомелі, Віцебску, Брэсце, Гродна, ва ўсіх раённых і сельскіх цэнтрах рэспублікі. На фасадах выбарчых участкаў палымнелі словы: «Сардэчна запрашаем!»

У гэты дзень народныя ўрачыстасці ў Беларусі разліліся ад пагранічнага Буга да сівога Дняпра, ад блакітных браслаўскіх азёр да нафтавых вышак Палесся. Усюды панавалі радасць і весялосць, таму што кожны раз выбары ў нас праходзяць як вялікае свята народнай дэмакратыі.

Сведчанне нашай дэмакратыі — склад кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў. Сярод іх — рабочыя і калгаснікі, вучоныя і настаўнікі, пісьменнікі і кампазітары, артысты і бібліятэкары. Гэта лепшыя сыны і дочкі нашага народа, якім ён даверыў прадстаўляць свае інтарэсы ў мясцовых органах самакіравання.

У нас кіруе краінай сам народ, ён вырашае дзяржаўныя справы. Па словах Уладзіміра Ільіча Леніна, Саветы — гэта ўлада, адкрытая для ўсіх, якая робіць усё на віду ў масы, даступная масе і выходзіць непасрэдна ад мас.

Ва ўсіх гарадах і сёлах, на ўсіх выбарчых участках галасаванне 16 сакавіка праходзіла ў абстаноўцы выключнай актыўнасці. Дастаткова сказаць, што к канцу дня ў нашай рэспубліцы выканала свой абавязак 99,7 працэнта выбаршчыкаў, а да 22 гадзін галасаванне паўсюдна было закончана.

У дзень выбараў на выбарчых участках прайшлі выступленні самадзейных і прафесіянальных артыстаў. У хлебазаводзе калгаса «Новы быт» Мінскага раёна пабываў Дзяржаўны народны хор БССР, у шахцёраў Салігорска выступілі артысты Белдзяржфілармоніі. Больш як 20 тысяч самадзейных спевакоў, танцораў, музыкантаў, чытальнікаў абслугоўвалі ў гэты дзень выбаршчыкаў Віцебшчыны.

Галасуючы за кандыдатаў непарушнага блока камуністаў і беспартыйных, працоўныя нашай рэспублікі галасавалі за новы росквіт Савецкай краіны, за яе новыя поспехі.

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ!

За вялікую работу па мастацкаму перакладу і прапагандзе беларускай літаратуры Прэзідыум Вярхоўнага Савета Беларускай ССР Указам ад 14 сакавіка 1969 года ўзнагародзіў Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР пісьменнікаў-перакладчыкаў: тт. Браунг М. Л., Ванага Ю. П., Гарбачова М. В., Жукаўскаса А. П., Йыгі О. Я., Кавалёва Д. М., Кабзарэўскага П. С., Камісараву (Браун) М. І., Малышку А. С., Нагнібеду М. Л.

КАРЫСНАЯ СУСТРЭЧА

Слухачы Наваполацкага народнага універсітэта мастацтваў запрасілі на свае чарговыя заняткі работнікаў Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Якуба Коласа. Віцебскія артысты прывезлі цікавую, а галоўнае — вельмі патрэбную для тых, хто вырашыў глыбей зазірнуць у таямніцы мастацтва, праграму. Народны артыст рэспублікі Ф. Шмакаў расказаў слухачам універсітэта аб тым, як ствараецца спектакль, як працуе акцёр над роллю. Артысты А. Кацельнікаў і У. Куляшоў чыталі вершы А. Вазнясенскага і У. Маякоўскага. Некалькі песень і музычных фельетонаў выканалі кампазітар Б. Насоўскі і артыст М. Цішачкін.

М. КАРОЛЬ.

МАЛАДЫМ ЧЫТАЧАМ

У Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У. І. Леніна адкрыты новыя тэматычныя выстаўкі кніг, прысвечаныя 100-годдзю з дня нараджэння правадыра. Для школьнікаў і навучэнцаў тэхнікумаў тут падабрана літаратура па тэмах: «Ленін аб адукацыі і камуністычным выхаванні моладзі», «Ленін аб кіруючай ролі КПСС у будаўніцтве сацыялізма і камунізма».

Лепшыя творы савецкіх і зарубежных пісьменнікаў пра Ільіча прадстаўлены на выстаўцы — «Вобраз Леніна ў мастацкай літаратуры».

М. РАЙКІНА.

ЦІКАВАЯ КАЛЕКЦЫЯ

Слесар зборачнага цэха Гомельскага станкабудаўнічага завода імя Кірава Р. Балотны працаглы час калекцыніруе юбілейныя і памятныя медалі. У яго калекцыі шмат медалей, прысвечаных мастацтву, спорту, вучоным, роднаму гораду. Сабрай калекцыянер і цэлую серыю медалей — каля ста, — прысвечаных заснавальніку Савецкай дзяржавы і Камуністычнай партыі Уладзіміру Ільічу Леніну. На іх Ільіч адлюстраваны ў розныя перыяды жыцця. Ленінская тэма стала асноўнай і вядучай у калекцыі.

— Цяпер у маіх планах, — гаворыць Р. Балотны, — набыць рад новых медалей аб правадыру і разам з іншымі калекцыянерамі Гомеля арганізаваць выстаўку, прысвечаную знамянальнаму юбілею — 100-годдзю з дня нараджэння правадыра.

Б. СЯМЕНАЎ.

НАШ СУМЕСНЫ КЛОПАТ

ПРЭЗІДЫУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ, МІНІСТЭРСТВА АСВЕТЫ БССР, ДЗЯРЖАЎНЫ КАМІТЭТ САВЕТА МІНІСТРАЎ БССР ПА ДРУКУ, ЦК ЛКСМБ І ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ» АБМЯРКОЎВАЮЦЬ ПЫТАННІ РАЗВІЦЦЯ ЛІТАРАТУРЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

14 сакавіка адбылося пашыранае пасяджэнне прэзідыума праўлення Саюза пісьменнікаў БССР сумесна з прадстаўнікамі Міністэрства асветы рэспублікі, Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па друку, ЦК ЛКСМБ, выдавецтва «Беларусь». Пасяджэнне было прысвечана пытанням развіцця літаратуры для дзяцей.

З дакладам аб стане і задачах беларускай дзіцячай літаратуры на пасяджэнні выступіў сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Янка Брыль (даклад з некаторымі скарачэннямі друкуецца ў сённяшнім нумары нашай газеты). У дыскусіі прынялі ўдзел міністр асветы БССР М. Мінкевіч, старэйшы дзіцячы пісьменнік, заслужаны дзеяч культуры рэспублікі Алесь Якімовіч, Васіль Хомчанка, супрацоўніца дзіцячага аддзела бібліятэкі Палаца культуры прафсаюзаў А. Тарасава, загадчык рэдакцыі дзіцячай і юнацкай літаратуры выдавецтва «Беларусь» Аркадзь Марціновіч, загадчык сектара навукова-метадычнага кабінета па рабоце з дзецьмі Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна З. Дз'яканава, Васіль Вітка, кандыдат філалагічных навук Э. Гурэвіч, рэдактар выдавецтва «Беларусь» Авяр'ян Дзеружынскі, рэдактар часопіса «Бярозка» Кастусь Кірэенка, Уладзімір Юрэвіч, старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па друку Р. Канавалаў.

Вынікі гаворкі коратка падсумаваў першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Максім Танк.

Па абмеркаваным пытанні была прынята разгорнутая пастанова.

Справаздача аб спрэчках па дакладу Янкі Брыля будзе апублікавана ў наступным нумары нашай газеты.

ДАКЛАД Янкі БРЫЛЯ

У пачатку 1966 года ў нас быў праведзены пленум, прысвечаны літаратуры для дзяцей. Пасля, праз тры месяцы, адбыўся пяты пісьменніцкі з'езд, на якім таксама ішла, між іншым, гаворка і пра дзіцячую літаратуру.

Што нас прымусіла вяртацца да гэтай тэмы зноў?

Ці толькі Саюзу пісьменнікаў належыць ініцыятыва арганізацыі сённяшняй нашай нарады?

Улетку мінулага года выдавецтва «Беларусь» запрашала вялікую групу пісьменнікаў, якія пішуць або пісалі калі-небудзь для дзяцей, і на той сустрэчы мы многа, зацікаўлена і ўстрывожана гаварылі пра вельмі нездавальняючы стан сучаснай дзіцячай літаратуры. Падобная сустрэча адбылася сёлета ў студзені ў Камітэце па друку Савета Міністраў БССР. Усесаюзны Камітэт па друку, з мэтай большай актывізацыі справы літаратуры для дзяцей, палічыў патрэбным стварыць савет па гэтай літаратуры, у які ўвайшлі пісьменнікі, мастакі і выдаўцы.

Зацікаўленасць, як бачым, калектыўная. Пра гэта, зрэшты, гаворыць і тое, што на сённяшні наш сход прыйшлі прадстаўнікі многіх установ, аб'яднаныя адным грамадскім клопатам.

Мы, літаратары, высока цэнім тую вялікую работу па стварэнні літаратуры для дзяцей, якую сістэматычна, кожны па-свойму, вядуць арганізатары і практыкі кніжнай справы, а таксама дзіцячыя журналісты і нашы руплівыя сябры — работнікі дзіцячых бібліятэк. Разам з тым, мы добра ведаем таксама і тое, што найбольшая адказнасць у гэтай справе кладзецца на нас, непасрэдных стваральнікаў кнігі, якія могуць быць і добрымі і дрэннымі — у першую чаргу дзякуючы нам ад на нашай віне.

Гэта не значыць, аднак, што сёння і я, як дакладчык, і іншыя пісьменнікі, што выступяць у спрэчках, будзем гаварыць пра станоўчыя і адмоўныя якасці новых твораў дзіцячай літаратуры, не закранаючы іншых пытанняў, не звязаных з творчасцю непасрэдна. Мы будзем рады і ўдзячны нашым паважаным гасцям, калі яны, між іншым ці спецыяльна, выкажуцца і пра кнігі, якія мы пішам.

Кожны з нас, літаратараў, ведае, што такое нялёгкая праца пісьменніка, кожны з нас ведае смак паражэння, заслужаны і незаслужаны боль, які нам прыносіць крытыка. Кожны з нас — паасобку. А ўсе мы, разам узятыя, калі і з выключэннямі, дык з вельмі нешматлікімі, не надта любім задумвацца над тым, а як жа ўсё такі спалучаць чалавечую, таварыскую добразычлівасць з тою калючай, горкаю праўдай, якую мы — хочаш не хочаш — абавязаны адзін аднаму гаварыць.

Куды лягчэй і спакайней, вядома, маўчаць, хаваць сваю думку або прыкрываць яе «прыязным» словам няшчырай, безадказнай пахвалы. Амаль па прыказцы: «І крытык сыты, і кнігі цэлыя». А ёсць яшчэ прыказка і такая: «Не чапай нікога і не бойся нічога»...

Не наша тэта, з дазволу сказаць, філасофія.

Лепш прыгадаем вядомую думку, што для дзяцей трэба пісаць таксама як і для дарослых, толькі яшчэ лепш. Ды і крытыкаваць дзіцячую літаратуру трэба, відаць, з той жа сур'ёзнасцю, што і літаратуру для дарослых.

Дакладчыца на пленуме і садакладчыца на з'ездзе 1966 года Эдзі Агняцвет, пры ўсім сваім зразумелым жаданні ўголас парадавацца станоўчаму, вымушана была ўсё-такі больш гаварыць пра недахопы нашай дзіцячай літаратуры, з жаночай далікатнасцю далёка не ўсюды прымаюўваючы сваю крытыку да канкрэтных кніг і імён, аднак крытыкуючы іх, па-сутнасці, жорстка. Няма патрэбы паўтараць тое, што было сказана пра дасягненні і недахопы дзяўездаўскага перыяду. Давайце памяркуем пра тое, што мы набылі за тры апошнія гады.

Гутарка ў нас, па задуме, павінна быць не парадная, а дзелавая, сёння больш мэтазгодна не заспакойвацца наяўнасцю поўных або частковых удач, а гаварыць са свядома найбольшай самакрытычнасцю, якая нам вельмі і вельмі не пашкодзіць.

Напісана ў нас для дзяцей апошнім часам не менш, чым пісалася раней, і я не бачу неабходнасці называць тут як мага больш кніг — гэта было б месцамі залішне сумна. За тры няпоўныя гады выдавецтва «Беларусь» выпусціла іх больш за сотню. Загадзя прашу прабачэння ў тых, чыю нядрэнную кнігу я не назваў, адмовіўшыся ад традыцыйнага пераліку, а таксама і ў тых — і так бывае, — хто будзе мець на мяне крыўду, што яго слабую кнігу я назваў, нібыта нават з нейкай асаблівай прыемнасцю, а вось пра кнігу другога таварыша, яшчэ горшую, не сказаў ні слова. Справа не ў гэтым. У выпадках прыватных кожнаму можна і паправіць і дапоўніць дакладчыка: важней за ўсё тое, каб мы нагаварылі як мага больш прынцыпова пра галоўнае, — чаму ў нас мала добрых кніжак для дзяцей і што рабіць, каб іх набольшала.

Гаворку пра дасягненні апошніх трох гадоў хочацца пачаць з дзвюх вельмі прыемных з'яў: у нас выйшла, нарэшце, салідная, добра афармленая двухтомная анталогія дзіцячай паэзіі і прозы і, па-другое, у нас хораша ажывілася справа з выданнем «школьнай серыі». Перспектыўным планам выдавецтва «Беларусь» прадугледжана перавыданне анталогіі ў дапоўненым, удасканаленым выглядзе. Гэта добра. Яшчэ лепш тое, што «школьная серыя», даўшы нашаму юнаму чытачу 36 кніг за тры гады, у далейшым думае пашырыцца. На 1969 год запланавана, напрыклад, ужо 18 кніг. Сумесна з таварышамі з выдавецтва «Народная асвета» мы склалі нядаўна перспектыўны план гэтай серыі: на пяцігодку — каля 80 кніг. Хочацца ад душы і прывітаць гэта, і пажадаць, каб наша «школьная серыя» выходзіла яшчэ спраўней — у лепшым падборы твораў, у больш дасканалым афармленні, яшчэ большымі тыражамі.

Наш дарослы чытач і «дарослая» крытыка дружна заўважылі і ўхвалілі аўтабіяграфічную трылогію Алены Васілевіч — аповесці «Расці, Ганька», «Доля знойдзе цябе» і «Новы свет». Я ўжо таксама выказаў публічна сваю станоўчую думку пра гэтыя таленавітыя аповесці. Пасля надрукавання ў «Полымі» — на поўным праве «дарослай» прозы — дзве з іх выдадзены дзіцячай рэдакцыяй выдавецтва «Беларусь».

Паэма Анатоля Вялюгіна «Вецер з Волгі» — па-мойму, найлепшая рэч у нашай лірыцы — першы раз была выдадзена дзіцячай рэдакцыяй, а другі раз, пасля дапрацоўкі, выйшла ў рэдакцыі мастацкай літаратуры. Што ж, скажам, цытуючы Маякоўскага: калі добра, дык добра «и большим и детям».

Варта задумацца над прычынамі такіх удач. Сказаць, што А. Васілевіч і А. Вялюгін — пісьменнікі таленавітыя — гэта будзе далёка не ўсё. Трэба дадаць, мне думаецца, яшчэ адно: яны пісалі гэтыя рэчы на ўсю душу, не думаючы асабліва, што пішуць для дзяцей, не прыгінаючыся да іх і не сюсюкаючы з імі.

Да ўдач такога характару — кніг цікавых і для малых і дарослых чытачоў — можна аднесці аповесць Алеся Якімовіча «Канец сервітута», аповесць Хведара Жычкі «Дзе растуць бяссмертнікі» і першую кнігу гомельскага журналіста, дэбютанта ў мастацкай прозе Івана Сяркова «Мы з Санькам у тыле ворага».

«Канец сервітута» — адна з найбольш удалых аповесцей ветэрана нашай літаратуры для дзяцей, які, дарэчы, нямала і плённа папрацаваў для яе як паэт, празаік, перакладчык і рэдактар. Напісаная вопытнай рукою літаратара, які добра ведае свайго маленькага і юнага чытача, цікавая і пазнавальная, кніга гэтая будзе чытацца.

Аповесць Хв. Жычкі напісана пра юных следапытаў, на тэму, можна сказаць, апошнім часам у дзіцячай літаратуры модную. Чытаецца яна з цікавасцю, як рэч арыгінальная, свежая, з многімі добрымі прыкметамі сапраўднай прозы. Можна і трэба папракнуць аўтара ў тым, што сям-там у яго заўважаецца белая нітка ўмоўнасці формы. Апавяданне вядзецца ад імя многіх герояў, на многія галасы, і вельмі б хацелася, каб гэтыя галасы гучалі кожны па-свойму, яшчэ больш індывідуалізавана і ярка. Гэтага аўтару можна і варта дамагчыся, дапрацоўваючы аповесць для новага выдання, якога яна па-мойму, дачакаецца. А галоўнае ў кнізе ёсць — у ёй жыццё, якому верыш, якое хвалюе.

Кнігу І. Сяркова прыхільна сустрэў і чытач, і перш за ўсё, пісьменніцкая грамадскасць. Апошняе могуць засведчыць многія з нас, пра гэта гаварылася і на сходзе, прысвечаным абмеркаванню гэтай аповесці. І пры тых недахопах, якія ёсць у кнізе, якія аўтару няцяжка выправіць для наступнага выдання аповесць Сяркова — кніга цікавая і вясёлая.

Аднак, у тым факце, што мы сустрэлі гэтую кнігу з прыхільнасцю не толькі шчырай і дружнай, але і трохі авансам завышанай, мне бачыцца і наша калектыўнае прызнанне ў тым, як мала ў нас таленавітых, па-сапраўднаму ўдалых кніг для дзяцей і як моцна мы адчуваем патрэбу ў такіх кнігах.

Апроч названых, з адноснага мноства кніг і кніжачак прыемна, светла вылучаюцца тры, адрасаваныя маленькім: «Зімовы дождж», Васіля Хомчанкі, «Будзільнік» Станіслава Шушкевіча і «Перапёлка» Дануты Бічэль.

Па-мойму, Б. Хомчанку якраз найбольш удаюцца кароткія апавяданні для маленькага чытача. Некаторыя з іх прыемна напамінаюць класічныя ўзоры — апавяданні М. Прышвіна і Л. Талстога, — напамінаюць сваёй празрыстасцю, немнагаслоўнасцю, сур'ёзнасцю задумы і чысцінёй мовы, пазбаўленай прысутнасці лютага ворага дзіцячай літаратуры — сентыментальнасці.

Адзін маленькі прыклад. Падвозячы на будаўніцтва цэглу, шафёры губляюць яе на калдобінах. А тут ідзе на тратуары, набраўшыся за рукі, шнурок гаварлівай малечы з дзіцячага саду. Пачынаюць тыя цагліны падніматься. Пры дапамозе выхавацельніцы выспявае намер занесці іх туды, дзе будуецца дом, балазе, гэта недалёка. Як жа тут лёгка збіцца на саладжавую дыдактыку! А вось не збіўся Хомчанка, і мне надоўга запомніцца гэты паход з цяжкімі цаглінамі ў маленькіх руках, радасць дзяцей, іх развагі перад высокай сцяною, пасля, праз некалькі дзён: каб не цагліны, якія мы паднялі на дарозе — у сцяне была б дзірка!.. Проста і добра, таленавіта.

Вершы Д. Бічэль па сваёй лаканічнасці і паэтычнай свежасці шчасліва блізкія да нашага дзіцячага фальклору, да цудоўнай і несмяротнай творчасці шматлікіх пакаленняў беларускіх бабуль і матак. Калі ж гаварыць пра сучасную нашу паэзію для найменшых, дык можна ўжо сёння сказаць, што лепшыя з вершаў зборніка «Перапёлка» надзейна ўзбагачаюць яе, становяцца побач з вершамі такіх майстроў гэтага жанру, як В. Вітка, Р. Барадулін, С. Шушкевіч.

У. «Будзільніку», сваёй новай кнізе для дашкольнікаў, С. Шушкевіч зноў засведчыў, што ён умее бачыць свет у дробязях, у мноstве паэтычных мікрасветаў, праз пазнаванне якіх ідзе ў маленстве пазнаванне жыцця, умее дапамагаць свайму чытачу адкрываць жыццёвыя таямніцы мудра і весела. Большасць вершаў зборніка чытаецца з удзячнай усмешкай.

Апошнім часам выйшла нямала зборнікаў апавяданняў для дзяцей ўсіх трох узростаў — малых, сярэдніх і старэйшых. І што ж, пачынаючы ад вопытных аўтараў: Т. Хадкевіча, Я. Бяганскай, П. Рунца і да наймалодшых: Р. Ігнатенкі, Б. Казанава, С. Міхальчука, — пра ніводную кнігу, калі зусім без скідак, нельга сказаць, што яна ўдалася аўтару цалкам. У кожнай з іх адносна вельмі мала апавяданняў па-сапраўднаму цікавых, належна вынашаных, значных па задуме і дасканалых па выкананні. Тры, два, а то і адно ўдалае апавяданне ў зборніку, часамі і не малым — гэта яшчэ не кніга.

Не вельмі багатая і тэматыка нашых дзіцячых апавяданняў. Бадай найбольш іх прысвечана роднай прыродзе, яе прыгажосці, правільным і няправільным адносінам да захавання яе багацця. Гэта, вядома, добра. Шкада толькі, што ў апавяданнях на гэтую тэму зашмат паўзучай, мнагаслоўнай апісальнасці і лабавой дыдактыкі. У такіх рэчах вельмі важна, бясспрэчна, і пазнаваўчы бок. Але яшчэ больш важны

(Заканчэнне на 3-й стар.).

ГАРАЧАЯ КРОЎ ТЭАТРА «РАМЭН»

15 сакавіка ў Мінску ў Палацы спорту спектаклем «Гарачая кроў» пачаліся гастролі Маскоўскага тэатра «Рамэн». Мінчане цёпла прымаюць гасцей.

Пасля спектакля наш карэспандэнт сустрэўся з галоўным рэжысёрам тэатра Сямёнам Арнадзьевічам Баркнам.

— Хаця ваш тэатр ужо бываў у Мінску, усё роўна хацелася б, каб вы расказалі нашым чытачам, а гэта значыць, і вашым гледачам крышачку аб гісторыі тэатра.

— Мы ўжо не такія маладыя, але не такія і старыя: нам трыццаць восем. Мне здаецца — гэта той узрост, калі ўжо набыты дастатковы вопыт і наперадзе нямала дарог для пошукаў і дзярзанняў...

Тэатр створаны ў 1931 годзе пры непасрэдным удзеле Анатолія Васільевіча Луначарскага. Базай з'явіўся невялічкі літаратурны гурток цыганоў. Пачыналі, натуральна, з наіўнай, як па сённяшніх уяўленнях, драматургіі, з фальклорных спектакляў. Паступова раслі, набіраліся сілы, а калі адчулі сябе дастаткова падрыхтаванымі — звярнуліся да класікі. На афішах з'явіліся «Цыганы» Пушкіна, «Макар Чудра» Горкага, «Алеся» Купрына, «Эсмеральда» Гюго, шмат іншых твораў.

Я звязаны з гэтым тэатрам семнаццаць гадоў. Якім ён стаў — меркаваць не мне. Гэта справа крытыкаў і гледачоў.

— Пяць тысяч гледачоў на адным спектаклі — гэта ўжо важкая лічэнка. Калі вы рызыкнулі ўсе спектаклі паказваць у такім велізарным памяшканні — значыць, адчуваеце ў сабе дастаткова сілы для гэтага.

— Як вам сказаць. Такія выступленні заўсёды вельмі і вельмі адказныя і патрабуюць ад акцёраў максімум сілы, майстэрства і самааддачы. Мы пастараемся, як кажуць, «выкласціся», каб мінчане палюбілі нас і сумавалі, калі мы паедзем. Мінулыя нашы гастролі былі, як нам здаецца, удалымі, і мы з вялікай цеплынёй успамінаем вашых гледачоў, ваш цудоўны горад. Так што ехалі сюды з вялікай радасцю, як да сваіх старых сяброў.

— Калі можна, хоць бы коратка, прадстаўце вашу трупу, моладзь тэатра.

— У трупе семдзесят пяць акцёраў. Сярод вядучых хочацца назваць заслужаных артыстаў Вольгу Пятрову, Вольгу Янкоўскую, Тамілу Агаміраву, Васіля Бізева, артыстаў Санціну Андрэеву, Надзею Міхайлаву, Варвару Вярбіцкую, Сяргея Шышкова, Сяргея Залатарова, Валянціна Баглаенку. Нашы пастаянныя масюоўскія гледачы ўжо добра ведаюць і любяць іх. Спадзяёмся, што іх палюбяць і мінчане.

Мы ганарымся артыстамі, чые імёны сталі вядомы не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі. Гэта — Мікалай Слічэнка. Аб вялікай папулярнасці і поспеху Слічэнкі гаворыць хоць бы той факт, што зараз аб ім здымаецца поўнаметражны каляровы дакументальны фільм.

Зусім нядаўна з працяглай гастрольнай паездкі па Балгарыі і Польшчы вярнуліся вядомыя артысты нашага тэатра Рада і Мікалай Валшанінавы.

Аб трупе, якую любіш, можна расказваць бясконца. Вось вы спыталіся аб нашай моладзі, аб нашым папаўненні. Павінен сказаць, што акцёраў для тэатра мы шукаем усюды. І як правіла, нам шанцуе: трапляюцца таленавітыя людзі. Праз тры-чатыры гады пад кіраўніцтвам вопытных акцёраў яны становяцца нашай апорай, займаюць вядучае месца ў рэпертуары. Вось і зараз у нас многа цікавай моладзі: Лёля Баброва, Іра Някрасава, Роза Джэлакаева, Пётр Дзметр, Наташа Бізева і іншыя. І яшчэ трэба сказаць, што амаль ножны акцёр нашага тэатра — гэта складаны чалавечы лёс. Але аб гэтым у каротнім інтэрв'ю не раскажаш.

— Ну, і апошняе пытанне — аб рэпертуары: як кажуць, што было, што ёсць і чым сэрца супакоіцца.

— У рэпертуары шмат п'ес з жыцця цыган розных краін. П'еса Эдэ Сеглегеці «Сям'я цыгана» расказвае аб жыцці цыган у Венгрыі, Балванта Гаргі «Соні і Махіваль» — Індыі, «Кармэн» — Іспаніі. Пра класіку я ўжо гаварыў. Галоўныя нашы клопаты таксама, як і ў астатніх тэатрах, — гэта сучасны рэпертуар. Напярэдадні прыезду ў Мінск мы здалі сваю новую работу «Хто кіне камень». У аснове п'есы факты, сведкам яніх быў акцёр і драматург нашага тэатра Мікалай Нарожны. Гэтую п'есу ён напісаў у саўтарстве з Анатолем Галіевым. Аб жыцці сучасных цыган расказваецца ў п'есах Ігара Шведава «Ром баро» і Ільва Мітрафанава «Песня на досвітку». Спектаклі па гэтых п'есах да 50-годдзя Савецкай улады былі адзначаны Ганаровымі дыпломамі. На жаль, у Мінск мы змаглі прывезці толькі тры спектаклі з нашага даволі вялікага рэпертуару: «Гарачая кроў», «Чатыры жаніхі» і «Аб чым спявала скрыпка».

Да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча мы рыхтуем спектакль па п'есе Ю. Нагібіна і І. Ром-Лебедзева «Люлька».

Наперадзе ў нас сустрэча з драматургам Ісідарам Штокам, дакладной, з яго вельмі цікавай п'есай «За сяброўскай гутаркай». Думаем падрыхтаваць кампазіцыю па цыганскім цыкле вершаў Гарсіа Лоркі. У партфелі — п'еса У. Лугавога і В. Гарохава «Прынц і Маша», п'еса з жыцця французскіх цыган. Ну, а чым сэрца супакоіцца? Сэрца нашага калектыву ніколі не супакоіцца, таму што ў жылах «Рамэна» пульсуе гарачая кроў.

АД ЦК КП БЕЛАРУСІ, ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР І САВЕТА МІНІСТРАЎ БССР

Цэнтральны Камітэт КП Беларусі, Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР і Савет Міністраў БССР з глыбокім жалем паведамляюць, што 17 сакавіка 1969 года раптоўна памёр прэзідэнт Акадэміі навук БССР Васіль Феафілавіч КУПРЭВІЧ, член ЦК КП Беларусі, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР, Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны дзеяч навукі БССР, член-карэспандэнт Акадэміі навук СССР.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КП БЕЛАРУСІ — ПРЭЗІДЫУМ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР — САВЕТ МІНІСТРАЎ БССР

© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

А КУРАТНЫ белы домік. Жыве ў ім Вольга Андрэеўна Гойшык. Самы вялікі пакой яго займае музей, у якім сабраны матэрыялы аб яе сыне — юным герої Колі Гойшыку.

Гэты дом добра ведаюць івацэвіцкія піянеры. У ім заўсёды поўна дзяцей.

— Вольга Андрэеўна, раскажыце, калі ласка, пра Колю, — просяць школьнікі.

...Трынаццацігадовым хлопчыкам прыйшоў Гойшык у партызанскі атрад. Тут яго прынялі ў камсамол. «Клянуся змагацца з ворагам да апошняга дыхання», — сказаў юны партызан, прымаючы камсамольскі білет. Коля Гойшык удзельнічаў у многіх баявых аперацыях, пускаў пад адхон варожыя эшалоны. У красавіку 1944 года пры выкананні баявога задання ён геройскі загінуў...

Стараючыся не прапусціць ніводнага слова, слухаюць Вольгу Андрэеўну піянеры школы № 2 г. Івацэвічы.

Фота В. ГЕРМАНА. (БЕЛТА).

ПЕРАКЛІЧКА СЕЛЬСКІХ КЛУБАЎ

У НАГУ З ЖЫЦЦЁМ

Эдуард ПЕТРЫК,
загадчык Шчучынскага раённага аддзела культуры

Мінулы год для культасветработнікаў быў не з лёгкіх. Шмат давялося ім папрацаваць, каб свята роднай Беларусі было ўрачыстым, каб у клубах і дамах культуры, як ніколі, гучалі песні, музыка.

У нашым раёне зараз чатырнаццаць культасветустаноў носяць гаяровае званне клуба альбо бібліятэкі выдатнай работы. Працуюць больш двухсот гурткоў мастацкай самадзейнасці, якія аб'ядноўваюць каля трох тысяч удзельнікаў.

Многія выканкомы сельскіх Саветаў у апошні час сталі больш увагі ўдзяляць клубам і бібліятэкам, канкрэтна кіраваць іх работай. Праяўляюць клопаты аб культасветустановах калгасы і саўгасы.

У мінулым годзе за сродкі гаспадарак пабудаваны чатыры тыпавыя клубы. Некаторыя сельгасарцелі ў лік культфондаў набылі для клубаў мэблю, музычныя інструменты, тэлевізары. Карацей, культасветустановы за леташні год значна пабагацелі.

Зараз, калі працоўныя ўсёй краіны рыхтуюцца дастойна сустрэць 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна, культасветработнікі раёна абавязаліся значна палепшыць дзейнасць клубаў і бібліятэк па камуністычным выхаванні працоўных.

Але новы якасны скачок у рабоце залежыць ад таго, як будуць працаваць кадры. Мы вучым іх працаваць у новых умовах, максімальна скарыстоўваючы накоплены ў час падрыхтоўкі да 50-годдзя БССР і святкавання юбілею рэспублікі вопыт. У студзені правялі двухдзённы семінар, расказалі, як лепш весці прапаганду ленінскай спадчыны. Акрамя дакладаў і лекцый, зрабілі экскурсію ў ленінскі пакой Багушоўскага Дома культуры.

Цікавы семінар адбыўся ў нас на гэтых днях. Загадчык аддзела прапаганды райкома партыі Яўгенія Мікалаеўна Строк зрабіла даклад «Ідэі Леніна жывуць і перамагаюць». Вопытам работы па прапагандзе ленінскай спадчыны падзяліліся загадчыкі сельскіх клубаў Марыя Хох, Яніна Цэніна і іншыя.

Асабліва разнастайныя формы і метады культурнаасветніцкай работы скарыстоўвалі летась Чапаеўскі, Нарашанскі, Баліцкі сельскія клубы. Тут наладжваліся цікавыя тэматычныя вечары, сустрэчы са старымі камуністамі, ветэранамі вайны, актыўна працавалі гурткі мастацкай самадзейнасці. Ажывілася дзейнасць і многіх іншых клубаў. Лепшыя з іх з'яўляюцца своеасаблівымі апорнымі пунктамі раённага аддзела культуры. Яны памагаюць нам распаўсюджваць перадавы вопыт клубнай работы. Вось прыклад. Нарашанскім сельскім клубам загадвае Зінаіда Мялешка. Гэта—вопытны і ініцыятыўны спецыяліст. А ў суседнім Алішкоўскім клубе працуе маладая дзяўчына, учарашняя дзесяцікласніца. Мялешка ўзяла над ёй шэфства, заўсёды запрашае на тэматычныя вечары, паглядзець канцэрты, павучыцца.

Нарашанскі сельскі клуб — свайго роду акадэмія для культасветработнікаў бліжэйшых вёсак. Такія «акадэміі» ёсць у кожным сельскім Савеце. Часта на дапамогу загадчыкам апорных пунктаў выязджаюць метадысты раённага Дома культуры, выкладчыкі дзіцячай музычнай школы. У клубах зараз распрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы па дастойнай сустрэчы 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна.

Аддзел культуры разам з рэдакцыяй раённай газеты неўзабаве мяркуе правесці пераклічку сельскіх клубаў. На старонках раённай газеты выступяць не толькі культасветработнікі, але і старшыні выканкомаў сельскіх Саветаў, сакратары партыйных арганізацый калгасаў і саўгасаў. Яны раскажуць, як установы культуры праводзяць масава-палітычную работу сярод насельніцтва ў гэтыя дні.

Пачала «падарожжа» эстафета пад дэвізам: «100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна — дастойную сустрэчу». Кожная ўстанова культуры афармляе альбом аб сваёй рабоце — «візітную картку». Але з адной «карткай» не паедзеш да суседа перадаваць эстафету, трэба везці канцэрт, добры тэматычны вечар і т. п.

У апошні час клубныя ўстановы значна ажывілі прапаганду ленінскай спадчыны: праводзяцца тэматычныя вечары, вусныя часопісы, ленінскія чытанні.

Цікава прайшоў вусны часопіс «Таварыш Ленін, мы вам дакладаем» у Багушоўскім сельскім Доме культуры. Падрыхтавалі яго настаўнікі, спецыялісты сельскай гаспадаркі. У часопіс былі ўключаны старонкі: «Мы прыйдзем да перамогі камуністычнай працы», «Культурная рэвалюцыя ў СССР— выкананы ленінскі запавет», «Перамога ленінскіх ідэй». На вечары выступілі ўдзельнікі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Старшыня калгаса імя Кірава Р. Іоч расказаў аб росквіце ўсіх галін грамадскай гаспадаркі, аб выкананні пяцігадовага плана і будучым сельгасарцелі.

Са студзеня месяца ўсе ўстановы культуры раёна пачалі праводзіць ленінскія чытанні. Не так даўно ў Ражанкаўскім клубе адбылося чытанне на тэму «Ленін—правадыр Вялікага Кастрычніка». Задоўга да вечара былі афармлены кніжныя выстаўкі «Ленін і партыя», «Ленін і рэвалюцыйны рух у Беларусі». Пасля былі паказаны кінафільмы пра Ільіча. Мясцовым жыхарам гэты вечар спадабаўся.

У Спушанскім клубе арганізуюцца «Ленінскія пятніцы». У гэтыя дні праводзяцца гутаркі чытанні, бібліяграфічныя агляды твораў аб жыцці і дзейнасці У. І. Леніна.

Цяпер у многіх клубах, дамах культуры рыхтуюцца літаратурна-музычныя вечары «Песні, з якімі ішлі ў Кастрычнік», «Ленін і мастацтва». На гэтых вечарах гучыць музыка, песні, бывае, што спявае ўся зала.

Карыстаецца папулярнасцю гледачоў кінафестываль «Гэты шлях нам Ленін указаў», які праводзіцца ва ўсіх сельскіх клубах. У праграму фестываля ўключаны фільмы «Ленін у Кастрычніку», «Ленін у 1918 годзе», «Чалавек з ружжом», «Вялікі грамадзянін», «Камуніст» і іншыя. Перад пачаткам кінасеансаў выступаюць старыя камуністы, удзельнікі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Культасветустановы раёна актыўна дапамагаюць калгаснікам дабівацца новых поспехаў у дні ленінскай працоўнай вахты. Ва ўсіх клубах афармлены куткі работніка сельскай гаспадаркі. У іх ёсць літаратура для палаводаў і жывёлаводаў, спецыялістаў сельскай гаспадаркі, маляўнічыя стэнды аб вопыце перадавікоў вытворчасці, плакаты «За што змагаецца наша гаспадарка ў 1969 годзе», «баявыя лісткі».

Не так даўно клубы пачалі праводзіць вечары ўшаноўвання перадавікоў вытворчасці, ветэранаў працы. За кароткі час яны сталі вельмі папулярнымі. Ніколі не забудзе лепшая даярка саўгаса «Васілішкаўскі» Яніна Антонаўна Рыбак прысвечаны ёй вечар. Колькі цёплых слоў выказалі жанчыны-працаўніцы яе сяброўкі, аднавяскоўцы, камуністы. Затым самадзейныя артысты далі канцэрт, які складаўся з любімых песень Яніны Антонаўны.

Многія клубы дапамагаюць кіраўнікам гаспадарак праводзіць дні механізатараў, жывёлаводаў, палаводаў. Нядаўна гасцямі Бяросаўскага сельскага клуба былі механізатары. У святочна прыбранай зале сабраліся трактарысты, камбайнеры... Гасне святло. На экране—сяброўскія шаржы на перадавікоў, карыкатуры на нядбайных. Светавая газета спадабалася ўсім, прымусіла адных весела смяяцца, другіх — пачырванець. А потым адбыўся канцэрт. Гучалі песні па заяўках, частушкі на мясцовыя тэмы.

Культработнікі раёна стараюцца ўсе мерапрыемствы зрабіць эмацыянальнымі, яркімі, каб яны нікога не пакінулі раўнадушнымі. А гэтага нельга дабіцца без яскравых пошукаў, творчай ініцыятывы. Працаваць з аганьком, з поўнай аддачай сіл і энергіі—наш ганаровы абавязак.

ГАЛОЎНАЯ ТЭМА

У парадку дня чарговага сходу Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР было абмеркаванне старонкі «Рабочыя — майстрам культуры», апублікаванай у рэспубліканскай газеце «Звязда» 7 лютага 1969 года. Аўтары пісьмаў, змешчаных на старонцы, заклікалі работнікаў культурнага фронту часцей сустракацца з прадстаўнікамі фабрык, заводаў, будоўляў, наладжваць сумеснае абмеркаванне новых твораў, глыбей вывучаць жыццё прамысловых калектываў. Гэта будзе спрыяць стварэнню новых мастацкіх твораў.

— Усе мы разумеем, наколькі актуальныя пытанні ўзнімаюць рабочыя ў сваіх пісьмах,— сказаў пісьменнік Пётр Шасцярыкоў.—Мы ў вялікім даўгу перад рабочымі. Праўда, пісьменнікі Магілёўшчыны выступалі на будоўлях і прадпрыемствах, друкавалі нарысы пра перадавікоў вытворчасці. Але ў апошні час гэтыя добрыя сувязі аслабленыя. Улічваючы крытычныя заўвагі, выказаныя ў адрас літаратараў і дзеячоў культуры, мы абавязаны паправіць справу. У Магілёве ўзводзіцца буйнейшы ў краіне камбінат сінтэтычнага валакна. Мы маем магчымасць напісаць пра «Лаўсанбуд» добрую кнігу, як у 30-я гады была напісана беларускімі пісьменнікамі кніга пра Магілёўскую шаўковую фабрыку.

Шмат слушных заўваг і прапаноў выказалі пісьменнікі — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Аляксей Пысін, Васіль Матэвушаў, Якуб Усікаў, Іван Аношкін, выкладчык пединстытута, літаратуразнаўца Мікола Луфераў і іншыя.

Па абмеркаванаму пытанню сход прыняў рэзалюцыю, у якой выкладзены канкрэтныя мерапрыемствы па ўмацаванню творчых сувязей пісьменнікаў і рабочых.

А. ІВАНОЎ.

ДАЛУЧЭННЕ ДА СЛОВА

РОЗДУМ НАД ШКОЛЬНЫМІ САЧЫНЕННЯМІ

ШТО ТАКОЕ ШЧАСЦЕ? Хто з юнакоў і дзяўчат, калі гады падбіраюцца пад паўналецце, не задае сабе гэтае пытанне і не шукае на яго адказу! Вось і Вера Шчацініна, дзесяцікласніца Глыбачанскай школы на Ушаччыне, спрабуе разабрацца ў адным — з часто ж складаецца шчасце. «Рана ўстану — выбегу ў поле — шчасце». І гэта не рытарычны воклič, а сам змест жыцця аўтара і яе адмагодкаў, для якіх шчасце — у працы, у вучобе, у тым характве, што наўкол, у песнях, якія спяваюцца ў полі, у сонечным святле, у любві да свайго роднага краю, да Радзімы.

Выразны па думках і сціслы па форме верш «Шчасце» Вера прапанавала на Рэспубліканскі агляд школьных сачыненняў на тэму «Беларусь мая родная», які быў абвешчан леташняй вясной у сувязі з падрыхтоўкай да юбілею рэспублікі і яе Кампартыі.

Журы агляду, якое сабралася нядаўна, каб падвесці вынікі працы некалькіх дзесяткаў тысяч старшакласнікаў, прыйшло да здзіваднай згоды — не судзіць нікога надта строга і нейкім чынам падтрымаць юныя таленты, чые творы былі адабраны ў абласцях і гарадах рэспублікі. Твораў гэтых аказалася 48.

Пра што ж яны? Вядома, пра Беларусь, пра гераічны подзвіг нашага народа ў гады яго змагання з гітлераўскай навалай, пра замілаванне роднымі мясцінамі, нарэшце, некалькі сачыненняў, у якіх ёсць спробы стварыць партрэт нашага сучасніка, ёсць роздум над сённяшнім жыццём, якім яно паўстае перад старшакласнікамі.

Можна было б падрабязна нагаварыць тут пра вартасці некаторых сачыненняў, пра тыя агрэхі (лексічныя, стылістычныя, кампазіцыйныя), якія ёсць амаль у кожным творы. Адзнак пра гэта члены журы скажуць іх аўтарам, калі яны з'едуцца на творчую сустрэчу ў Мінск. Мне ж хочацца тут выказаць некаторыя меркаванні, звязаныя з выкладаннем мовы і літаратуры ў нашых школах.

Што перш-наперш кідаецца ў вочы пасля азнаямлення нават з тымі творамі, якія дайшлі да заключнага этапу агляду? Іх **несамастойнасць.** І несамастойнасць не ў тым сэнсе, што яны спісаны аднекуль, а ў тым, што аўтары, як правіла, не паказалі ў іх умення мысліць, разважаць па-свойму; у тым, што думаюць вучні па шаблону, выказваюць свае думкі пры дапамозе даволі абмежаванага запасу слоў.

Найбольш сачыненняў напісана пра ветэранаў рэвалюцыі, пра гераізм нашага народа ў Вялікую Айчынную вайну. Гэта — вынік той працы чырвоных следапытаў, якую правялі і праводзяць школьнікі над кіраўніцтвам камсамола ў апошнія гады, адкрываючы ўсё новыя і новыя імёны праслаўленых на ратным полі людзей. На жаль, за малым выключэннем, сачыненні гэтыя падобныя адно на адно пабудовай, стылем выкладання, лексікай.

Міжволі напрошваецца думка, што гэтыя дзяжурныя выразы, абмежаваны слоўнік, няўменне пашыраць яго за кошт сіноніму — вынік сур'ёзных недахопаў у выкладанні мовы і літаратуры, вынік таго, што настаўнікі звяртаюць мала ўвагі на тое, як гаворыць, як афармляе свае думкі вучань.

Многія аўтары абмежаваліся даволі падрабязным пераліком біяграфічных звестак пра свайго героя, голым пераказам подзвігу. Чаму? Відаць, таму, што яны не ўмеюць адбіраць факты, не разумеюць прынцыпаў мастацкага абагульнення. А між іншым, у школьных праграмах гэтаму адведзена пэўнае месца. Значыць, зноў-такі, за ўсім гэтым бачыцца віна настаўніка, які задавальняецца самым мінімальным: абы мог вучань якнебудзь пераказаць змест твора і вызначыць яго ідэю.

І яшчэ адно. Ці заўсёды на ўроках літаратуры і гісторыі, напрыклад, умеюць настаўнікі ўсхваляваць дзяцей расказам пра мужнасць і подзвіг, прымусіць іх прапусціць высокія словы праз сэрца, адчуць, зрабіць сваімі? Мусіць, не. Мусібыць, бывае так: праграма пройдзена, твор вывучаны і настаўнікі супакоены — маўляў задачы грамадзянскага выхавання пакалення вырашаюцца.

Гэта, між іншым, датычыць не толькі настаўнікаў, але і некаторых аўтараў кніг для дзяцей, тых, якія спадзяюцца, што сустрэча з высокай ідэяй абавязкова адбудзецца, нават калі яна і не знайшла дастатковага вобразнага ўвасаблення.

Не так ужо і цяжка напісаць сачыненне пра герояў вайны — залішне падрабязную, з веданнем тактычных тонкасцей вядзення бою, дэталізаваную інфармацыю на пяці—шасці старонках. Куды складаней напісаць пра героя, асэнсоўваючы кожны яго крок, учынак адпаведна **свайму разуменню.** Іменна гэтак напісала дзевяцікласніца Опсаўскай школы Браслаўскага раёна Ала Турок сваё апавяданне «Таямніца старога бору», а сямікласнік Аляксандр Шыбут з Райцаўскай школы на Гродзеншчыне—сачыненне «Беларусь мая родная».

Выхаванне думкі не можа ісці без выхавання пачуццяў, бо пераканаанні павінны сваімі карэннямі заглыбляцца ў сэрца. Выхаваўчая работа будзе мець глыбокі сэнс толькі ў тым выпадку, калі высокія ідэалы, якія адкрывае маладым людзям школа, абудзяць кожнага вучня да роздуму пра самога сябе, пра тое, хто ён і што ён зрабіў і павінен зрабіць для грамадства. І як жа радасна бывае на душы, калі ў сачыненнях школьнікаў трапляецца такое згоднае абуджэнне думкі і пачуццяў!

На вялікі жаль, у сачыненнях школьнікаў не надта часта сустракаешся са словам, народжаным у момант найвышэйшага душэўнага ўзрушэння. Апісальніцтва, пераказ пераважаюць над адлюстраваннем, паказам. І калі Святлана Навалетава з Гомеля звяртае маналог-роздум да сваёй вуліцы, верыш, што з такой канкрэтнай, адчувальнай любві можа нарадзіцца вялікае і святое пачуццё да Радзімы, да той краіны, дзе жывеш.

На агляд трапіла некалькі абразкоў прыроды. Насцярожвае ў іх буйная квяцістасць стылю, жаданне пакарыстацца метафарай, у сэнсе якой відаць, слаба разабраўся сам аўтар, грувасткасць сінтаксічных канструкцый (здараюцца перыяды ажно на дзве старонкі школьнага сшытка), вычварнасць мовы. Цяжка ўявіць пейзаж Беларусі па такіх, прыкладам, экзатычных падрабязнасцях, як «кудри ив плакучих» і «в розоватой дымке тополя». Альбо ўспрыняць канкрэтна вось такія радкі:

Разве можно вынуть из души
Радужные блики на березах
И в лесной тревожащей глуши
Зимние несбывчивые грезы.

Шмат у гэтых радках клопату аб тым, каб выказацца як мага «прыгажэй», і вельмі мала — пра думку, пра змест.

І зноў жа—хто ў гэтым вінаваты? Відаць, менавіта, настаўнікі мала звяртаюць увагі на дакладнасць слова, выразнасць вобраза ў рэцэнзіях сачыненнях. Бо — чаму дзесяцікласніца піша: вада «ўсё **зноўвае** на сваім шляху»? Чаму «дарогі не ў лепшым **становішчы»?** Чаму няма любві да жывога слова, адчування яго самабытнасці, непаўторнасці?

Дарэчы, недаравальна мала сачыненняў на беларускай мове: з 48 работ толькі 18 напісаны па-беларуску, з іх з Мінска — ніводнай. Калі ж казаць пра свабоду валодання словам, дык яна, як правіла, большая, вышэйшая ў тых, хто піша па-беларуску і асабліва ў вершах.

І яшчэ. Чаму так мала сачыненняў, напісаных хлопчыкамі, — усяго толькі пяць з 48? Зразумела, што хлопчыкі і юнакі больш захапляюцца дакладнымі навукамі, тэхнікай, спортам, але гэта не знімае са школы абавязку выхоўваць у іх любоў да слова. Ці не тоіцца тут пагроза аднабаковага выхавання?

Рэспубліканскі агляд школьных сачыненняў завершан. Многія вучні ўзяліся за пяро, каб падзяліцца сваімі думкамі, марамі, помыслам. Многія з іх напісалі творы, якія варты апублікавання на старонках перыядычнага друку, з якіх можна скласці цікавую кнігу. Можа варта пра гэта падумаць выдавецтву «Народная асвета»?

Выявілася, што найлепшыя поспехі паказалі вучні тых школ, дзе выкладанне мовы і літаратуры вядзецца творча, з сапраўдным клопатам пра выхаванне чалавечай асобы (Эсьмонская школа на Магілёўшчыне, Глыбачанская, Опсаўская і 12-я Полацкая на Віцебшчыне, 4-я Гомельская, 1-я Бярозаўская на Брэстчыне, Гарадзейская на Міншчыне, Галынкаўская — на Гродзеншчыне). Іменна вучні гэтых школ паспрабавалі ў сваіх творах паразважаць пра месца маладога чалавека ў нашым жыцці.

Жанрава сачыненні таксама даволі аднастайныя. Яны, як правіла, нешта неаформленае, што носіць занадта агульную назву «сачыненне». Пракідаюцца зрэдзь вершы, адно-два апавяданні, нарысы, старонкі дзённіка, а ў большасці — гібрыд артыкула з карэспандэнцыяй. Дзе публіцыстычны артыкул, нарыс, крытычны эцюд?

Тут, мабыць, пэўную віну павінны прыняць на сябе пісьменнікі. Бо, калі мы сустракаемся са школьнікамі, дык не надта рвемся шчыра пагутарыць з імі пра таямніцы пісьменніцкага майстэрства.

Рэспубліканскія агляды школьных сачыненняў павінны стаць традыцыйнымі, як алімпіяды па фізіцы, матэматыцы, хіміі. Праводзіць іх трэба больш арганізавана, з шырокім удзелам грамадскасці, у першую чаргу — з удзелам пісьменнікаў. Усё гэта дапаможа не толькі своечасова заўважыць сапраўдны талент, але і ўзняць усю справу выкладання мовы і літаратуры ў школах на новую і вышэйшую ступень.

Ул. ЮРЭВІЧ,
намеснік старшыні журы Рэспубліканскага агляду школьных сачыненняў.

ДНІ ЛЕНІНСКАЙ КНІГІ

Работнікі Дубровенскай раённай бібліятэкі правялі «Дзень ленінскай кнігі». У фае Дома культуры былі абсталяваны кніжныя выстаўкі: «Правадыр, таварыш, чалавек», «Ленін у Кастрычніку», «Яны ведалі Леніна», «Творы аб У. І. Леніне».

Наведвальнікі пасля азнаямлення з выстаўкамі занялі месцы ў глядзельнай зале. Перад імі выступіла загадчыца раённага аддзела культуры В. Барысава, бібліятэчныя работнікі М. Балдухаева і З. Ісаева. Яны зрабілі агляд ленінскай літаратуры. Аб вобразе У. І. Леніна ў мастацкай літаратуры расказала настаўніца З. Зайцава.

Потым удзельнікі мастацкай самадзейнасці прачыталі вершы і выканалі песні аб правадыру.

І. КОГАН.

СЕМІНАР ЗАЦЕЙНІКАЎ

У Віцебску адбыўся семінар масавікоў-зацейнікаў Віцебскай і Магілёўскай абласцей. У ім прынялі ўдзел старшыні культкамісій прафсаюзных камітэтаў прадпрыемстваў, загадчыкі сельскіх клубаў, культработнікі дамоў адпачынку і прафілакторыяў.

Семінар быў прысвечаны паляпшэнню арганізацыі масавага адпачынку працоўных. Яго ўдзельнікі праслухалі лекцыі аб мастацтве і педагагічнай этыцы масавіка, аб рэжысіцэ і майстэрстве зацейнікаў, аб народных гульнях і карагодах, аб арганізацыі і правядзенні літаратурна-музычных віктарын.

У рабоце семінара прынялі ўдзел найбольш волытныя работнікі культасветустаноў Мінска, Ленінграда, Віцебска.

«ЛЯВОНІХА» Ў ПАДМАСКОЎІ

Сонечнагорск, Фразіна, Моніна, Шчолкава, Ступіна — вось далёка не поўны пералік гарадоў, дзе за час сваіх гастроляў у Падмаскоўі пабываў калектыў эстраднага ансамбля Белдзяржфілармоніі «Лявоніха» (кіраўнік заслужаны артыст БССР Р. Мартынаў). І ўсюды выканаўчае майстэрства беларускіх артыстаў узнагароджвалася шчырымі апладысментамі гледачоў.

Выступленні «Лявоніхі» ў Падмаскоўі працягнуцца да 30 сакавіка. Мінчан чакаюць цёплыя сустрэчы з тэкстыльшчыкамі Арэхава-Зуева, хімікамі Васкрасенска, працоўнымі іншых гарадоў і сёл маскоўскай вобласці.

НОВЫ'Я НАЗВЫ НА АФІШАХ

Беларускі тэатр юнага гледача паказаў чарговую прэм'еру — спектакль «Малыш і Карлсан, які жыве на даху». П'есу С. Прохоф'евай па матывах аповесці нарвежскай пісьменніцы Астрыд Ліндгрэн пераклала на беларускую мову Т. Абакумоўская.

Рэжысёр спектакля Лесь Танюк, мастацкае афармленне Ю. Тура, кампазітар А. Эшпай. У спектаклі заняты артысты З. Паўлоўская, Т. Калеснік, М. Пятроў, Л. Цімафеева, К. Каралёва, Я. Горцава, Г. Раеўская, П. Ротэр, А. Кашпераў, В. Лебедзеў, Э. Шаміёнка, Ул. Кошаль.

На здымку — сцэна са спектакля. У ролі Малыша — Т. Калеснік, Бетан — Г. Раеўская.

Фота Ул. КРУКА.

МАСТАКІ БЕЛАРУСІ— ЮБІЛЕЮ ІЛЬІЧА

Выставачны камітэт Міністэрства культуры БССР пачаў адбор твораў мастакоў на рэспубліканскую выстаўку, прысвечаную 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. «Па ленінскаму шляху» — такі яе дэвіз. Прадстаўленыя на ёй творы жывапісу, графікі, скульптуры і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва адновяць вобраз вялікага правадыра рэвалюцыі, адлюструюць трыумф ленінскіх ідэй.

Адбылося першае абмеркаванне эскізаў і заключаны дагаворы на выкананне твораў.

Многія беларускія мастакі працягваюць работы над серыямі пейзажаў «Па ленінскіх месцах». Так, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Л. Лейтман стварае серыю акварэлей, якія назавуць мясціны, дзе жыў і працаваў У. І. Ленін. В. Вярсоцкім будуць прадстаўлены пейзажы «Па ленінскіх месцах у Польшчы, Парыжы, Лондане», над графічнымі лістамі «Крэмль. Рабочы кабінет У. І. Леніна», «Смольны — калыска рэвалюцыі», «Крэмль. Тайніцкі сад». працуе П. Дурчын.

Рад твораў мастакі прысвячаюць тэме сучаснасці, якая арганічна блізкая да ленінскай і з'яўляецца яе працягам. Мастак І. Давідовіч працуе над кампазіцыйным палатном «Сказ аб Беларусі», народны мастак БССР В. Цвірко — над серыяй тэматычных пейзажаў — «Мая Беларусь». Мінскім трактарабудаўнікам прысвяціў сваю работу мастак В. Сахненка. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР А. Паслядовіч заканчвае серыю лістоў з сельскага жыцця пад агульнай рубрыкай «Поры года», Б. Аракчэеў працуе над палатном «Хлеб».

(БЕЛТА).

У МАЙСТЭРНЯХ МАСТАКОЎ

ЗЕМЛЯКІ, СУЧАСНІКІ, ГЕРОІ

КАЛІ я сустрэўся з жывапісцам і графікам Ісаакам Бароўскім у яго майстэрні, на мальберце стаяла палатно — жаночы партрэт. Тонкія, як павуцінне, лініі рысунка. Шырокія мазкі асноўных каляровых плям. Вобраз маладой сельскай дзяўчыны вырашаўся ў яркім, мажорным каларыце: чырвоная кофтачка, яркая ўзорыстая хустка адцянялі пяшчотную смуглявасць аблічча.

Па тым, як вырашыў мастак твар дзяўчыны, адчуваецца яго імкненне перадаць абаяльнасць маладосці і душэўную шчырасць.

І так заўсёды ў Бароўскага. Яго партрэт — гэта заўсёды канкрэтная асоба з яркім характарам, з пэўнай вядучай рысай характару, якая дае партрэту «тэму». Больш таго — з рысамі мінулага і сённяшняга, як бы характар у развіцці.

Вось партрэт стомленага старога. Здавалася б, толькі ордэны сведчаць пра яго былыя подзвігі. Але прыгледзьцеся ўважлівей— і ўбачыце святло ўспамінаў у задумлівых вачах, суровую складку губ, цяжкія рукі воіна і рабочага.

Жывапісны «почырк» работ Бароўскага — выразна індывідуальны. Яго работы маслам вызначаюцца жорсткім контурам фігур і прадметаў, часта халоднымі, але заўсёды свежымі, гучнымі тонамі

Напрыклад, у «Партрэце медсястры» спалучэнне халоднага бляску марознага акна з бальнічнай беллю пакоя і крухмальным халатам сястры ўзмацняе ўражанне душэўнай чысціні, якая стала «тэмай» партрэта маладой жанчыны са строгім, уважлівым позіркам.

Лепшым работам Бароўскага ўласціва абагульненасць думкі і формы, цэласнасць задумы і мастацкага выканання. Гэта датычыць і яго работ не толькі ў партрэтным жанры. Вось, напрыклад, карціна «Вечарам», якую можна назваць жанравым партрэтам. Яна прасякнута цёплым пачуццём спачування чалавеку. У цэнтры—фігура дзяўчыны. Мяркуючы па яе ўбранні, яна збіралася на вечар або на спатканне, але здарылася нешта непрыемнае, а можа проста так засумавала. Спрабавала чытаць— не змагла. І цяпер стаіць, засмучаная... Удача мастака — і ў тонкай перадачы настрою, і ў жывапісным рашэнні — стрыманым, лаканічным, і ў самой кампазіцыі. Увагу гледача прыцягваюць спачатку галоўка дзяўчыны на фоне светлага квадрата акна, пасля — яе прыгожыя туфелькі, як бы падкрэсленыя светлавым рэфлексам. Гэтыя акцэнты робяць думку аўтара больш яснай. Прастата, яснасць задумы і ўвасабленне таго ці іншага твора прынеслі Бароўскаму заслужанае прызнанне гледачоў.

Ісак Бароўскі заўсёды працуе многа і натхнёна, з вялікім душэўным напружаннем. Але апошнія месяцы сталі для яго парой асабліва творчага ўздыму. Да 50-годдзя БССР ён падрыхтаваў шмат работ. Сярод іх партрэты прафесара-неўрапатолага І. Сасновіка, старога бальшавіка І. Мацвеева, студэнткі-піяністкі Лены Озеравай.

Тут жа, у майстэрні, і работы ў іншых відах выяўленчай тэхнікі — акварэлі, гравюры, малюнкі...

Акварэлі апошняга часу, гэтак жа, як і жывапіс, тэматычна звязаны з юбілеем Савецкай Беларусі. Вось, напрыклад, два гарадскія пейзажы. На адным з іх— вузкая вулка старога Віцебска, на другім — новы квартал, заліты сонечным святлом. Пейзажы — розныя па настроі, па сюжэтах, але, звязаныя адзін з адным, яны паказваюць роздум мастака пра гістарычны шлях Віцебска, пра яго сённяшні і заўтрашні дзень.

У большасці работ Бароўскага— выразны, трывалы почырк рысавальшчыка. Асабліва дакладныя яго накіды вугалем, алоўкам, фламайстрам. Сярод апошніх работ мастака — створаны вугалем партрэт «Маладая работніца». Самымі сціплымі сродкамі мастак імкнуўся перадаць у гэтым партрэце і жаноцкасць, і летуценнасць, і хітрынку гераіні партрэта.

Майстэрня мастака... Яна сведчыць, як многа яе гаспадар працуе. Вось апрача жывапісных работ, акварэлей і малюнкаў, — серыя графічных лістоў, прысвечаных гісторыі роднага горада. Чатырнаццаць гравюр склалі паліпціх, строгі па форме, дакладны па адчуванні рытму, па размяшчэнні чорных і белых плоскасцей. У гэтай цікавай па задуме рабоце знайшлі адлюстраванне і рэвалюцыйныя падзеі ў Віцебску, і Вялікая Айчынная вайна, і велічная праца народа па аднаўленні разбуранага ворагам, і сённяшні дзень горада на Дзвіне.

Ісак Бароўскі — актыўна ўдзельнічае ў мастацкіх выстаўках Віцебска, і кожнае знаёмства з яго творамі прыносіць гледачам новыя ўражанні.

С. БУТКЕВІЧ,
настаўнік.

г. Віцебск.

© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

© PDF: Kamunikat.org 2023 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

Кніжныя навінкі



Вокладкі новых кніг, якія выйшлі ў выдавецтве «Беларусь»: «У каралеўстве... але не ў казачным» А. Кобец-Філімонавай (мастак Б. Забораў), «Начны дождж» В. Матэвушава (мастак В. Шаранговіч), «Жураўліны досвітак» У. Карызны (мастак М. Пракапенка), «Мае заводчыкі» В. Мысліўца (мастак В. Сакалоў).

ПРАЗ УСЁ ЖЫЦЦЁ

Да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна народны тэатр Мінскага трактарнага завода рыхтуе спектакль па вядомай п'есе М. Пагодзіна «Трэцяя патэтычная». Адна з галоўных роляў у гэтым спектаклі даручана старэйшаму самадзейнаму артысту, рабочаму ліцейнага цэха Георгію Фёдаравічу Пушкевічу.

Амаль паўстагоддзя таму назад ён упершыню выступіў у аматарскім спектаклі «Казка пра цара Салтана» і з тае пары не расстаецца з самадзейнай сцэнай. За гэты час заўзяты аматар сыграў больш як сто роляў. Разам з калектывам заводскага народнага тэатра яму давялося выступаць у Ленінградзе, Кіеве, Вільнюсе, Калінінградзе і іншых гарадах краіны, а таксама ва многіх населеных пунктах нашай рэспублікі.

Г. Пушкевіч удзельнічаў у спектаклях «Год 1917-ы», «Юнацтва бацькоў». «Над хвалямі Серабранкі» і ва многіх іншых пастаноўках. На юбілейным вечары, прысвечаным шматгадовай дзейнасці самадзейнага артыста, Георгій Фёдаравіч выступіў у п'есе Я. Міровіча «Тэатр купца Япішкіна».

НАШ СУМЕСНЫ КЛОПАТ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

і настрой, якім прасякнута апавяданне, свежасць аўтарскага позірку і шчырасць або няшчырасць яго захаплення, якое мае ўласцівасць перадавацца або не перадавацца чытачу. Здавалася б, што новага можна расказаць пра такую аж надта звычайную птушку, як верабей? А вось у Сакалова-Мікітава мы нядаўна чыталі ў «Литературной газете» пра гэтага самага вераб'я рэч сапраўды мастацкую. Вельмі важна, якімі, чыімі вачыма маленькі чытач паглядзіць на свет, наколькі вочы гэтыя відушчыя і закаханыя ў тое, што бачаць.

Асобна сярод нашых апавядальнікаў стаіць Уладзімір Шыцік, аўтар кніг фантастычных, больш таго—касмічных апавяданняў «Зорны камень». Ул. Шыціку (няхай яму служыць удача!) шкодзіць пакуль што спецыфіка яго жанру, наяўнасць нейкай залішне вучонай таямнічасці. Аўтар павінен не толькі сам разбірацца ў навукова-тэхнічным рэквізіце сваіх апавяданняў, але і ўмела дапамагаць чытачу не адчуваць сябе прыгнечаным сваім апраўданым ці неапраўданым невуцтвам. У апавяданнях Ул. Шыціка даволі часта адчуваеш сябе нібыта ў нейкіх адсеках з процьмай таямнічых механізмаў, больш таго — часамі нават нібыта ідзеш па бясконцым калідоры, заваленым металаломам слоў. А гэта ж тэма—асваення чалавекам космасу—якраз патрабуе найбольшай паэтычнай яснасці, паэтычных узлётаў.

Дзе ўжо, вядома, патрэбны паэтычны ўзлёт, наогул паэзія, дык гэта ў кніжках, што лічацца паэтычнымі. Кніжак такіх я прачытаў каля 30-ці. Трэба шчыра прызнацца, што ва ўсім гэтым гомане, горш ці лепш зарыфмаваным, паэзіі сапраўднай — вельмі нямнога. Цяпло гэтай паэзіі, уменне бачыць яе ў прасторах, па-дзіцячы таямнічых з'явах і малюнках навакольнага свету, пяшчотнасць, дасціпнасць, вясёлая чалавечая дабрата прыемна адчуваецца ў лепшых вершах зборніка Хаіма Мальцінскага (асабліва ў тых вершах, якія пераклаў Р. Барадулін), у зборніках П. Макаля, М. Хведаровіча, В. Вярбы, М. Смагаровіча, С. Грахоўскага, Э. Агняцвет, А. Лойкі і некаторых іншых. Ёсць і такія зборнікі—П. Прыходзькі, Ул. Корбана, А. Дзеружынскага, М. Майсеевай, І. Васілеўскага, М. Парахневіча і зноў жа некаторых іншых—чытанне якіх наводзіць на менш вясёлыя думкі.

Аказваецца вершы для дзяцей маюць у нас поўнае права быць і празаічна шэрымі, і бязлітасна мнагаслоўнымі—доўгай вяровачкай з прыцілінканнем, і сентыментальнымі да нудоты. У іх можа быць вельмі многа сухой, траскатлівай, каляндарнай «публіцыстыкі», на ўзроўні горшых газетных стандартаў. Вершам, аказваецца, можна расказаць прымітыўныя гісторыйкі з прымітыўнай мараллю, называючы такія вершы байкамі, пішучы гэтыя байкі каструбаватым, нязграбным, хісткім на нозе раешнікам. Некаторыя вершы, залішне доўгія, могуць для разнастайнасці называцца паэмамі. У паэзіі для маленькіх дапускаецца перайманне або проста зарыфмоўванне дзіцячага фальклору, з наіўнай аўтарскай упэўненасцю, што і «Рэпку» і «Курачку рабу» можна зрабіць больш паэтычнымі, варта толькі расцягнуць іх як найдаўжэй, пры гэтым больш-менш прыстойна зарыфмаваўшы. Будзе, можа, трохі і горш, але ж будзе не проза, а—прашу прабачэння—паэзія...

Словам, многае можна, многае дазваляецца ў нашай паэзіі для дзяцей. І гэта сумна. І ненармальна. Пры ўсёй павазе да маіх сяброў-паэтаў можна было б гэтыя недахопы размеркаваць персанальна, як вопратку, паношаную ўжо і добра вядомую нам і на сабе і на другіх. А можна ў поўнай ступені лічыць гэтыя недахопы характэрнымі і для ўсіх, нават і для тых, у каго трапляюцца і добрыя, сапраўды паэтычныя вершы.

Чым можна вытлумачыць гэтую шэрасць? Тым, што для дзяцей пісаць вельмі цяжка? І гэтым, вядома. Аднак, мне здаецца, перш за ўсё тым, што, пішучы і выдаючы паэзію для дзяцей, менш патрабавальна, чым у паэзіі «дарослай», адносяцца да яе і самі паэты, і рэдактар гэтай прадукцыі. Я не агаварыўся: не рэдактары, а рэдактар, бо амаль усю дзіцячую паэзію (за выключэннем, бадай, сваёй уласнай) у выдавецтве «Беларусь» рэдагуе адзін чалавек, Аўяр'ян Дзеружынскі. Такое становішча, такі манапалізм нельга было б лічыць нармальным і для паэта ды і рэдактара значна мацнейшага.

Справа, вядома, не ў Дзеружынскім. Справа ў ільготным тарыфе, у той няпоўнай адказнасці, з якою да гэтага адносяцца перш за ўсё самі паэты.

Не лішне весела ў нас і з аповесцямі для дзяцей.

Куды больш сабранай, немнагаслоўнай і проста цікавай магла б выглядаць «Жоўтая акацыя» Ул. Дубоўкі. Ледзь не казачна-паэтычнай па задуме аповесці К. Кірэенкі «Сум і радасць дзеда Рэпкі» шкодзіць празмерна падрабязлівая, стамляючая грунтоўнасць апісанняў і гутарак, а яшчэ больш—сентыментальнасць. Кніга М. Герчыка «Аповесць пра залатую рыббу» перагружана тэхналогіяй развядзення акварыумных рыбак, што часта нагадвае больш дапаможнік, чым мастацкі твор, і такім частым ды шчодрым пералікам звонкіх і мудрагелістых назваў рыбак, што ствараецца ўражанне, нібыта ў кнізе іх больш, чым у сапраўднасці. Да палавіны аповесці аўтар напружана нагнятае дзеянне, як быццам надзімаючы вялізны мяч, а потым, з дазволу стомленага аўтара паветра з гэтага мяча выходзіць вельмі хутка: станоўчыя героі перамагаюць, адны адмоўныя хуценька перавыхоўваюцца, другіх выводзяць на чыстую ваду,— тая схема, якую чытач спачатку прадбачыў, становіцца зусім відавочнай. Вельмі прыблізна рускай здаецца месцамі і руская мова М. Герчыка, асабліва ў дыялогах.

За апошнія гады выйшла некалькі кніг на ваенна-патрыятычную тэму: «Вогненны танк» П. Беразняка, «Апавяданні пра Марата Казея» С. Шушкевіча, «Пажарніца» У. Паўлава, «Чырвоныя хвалі» В. Хомчанкі, «Камендант Міхееўскага лесу» В. Сіманавай, «Сэрца камунара» П. Ткачова і некаторыя іншыя.

Аддаючы належнае шчырасці аўтарскіх намераў, нядрэннаму ў некаторых таварышаў веданню матэрыялу, трэба, на жаль, сказаць, што гэта ніяк не апраўдвае ў адных выпадках пасрэдны, а ў другіх проста нізкі мастацкі ўзровень названых твораў, асабліва калі параўнаць іх з лепшымі рэчамі гэтага плана, скажам, такімі, як «Дрыгва» або «Міколка-паравоз», а тым больш, вядома, калі думаць пра сусветна-гістарычную веліч усенароднага подзвігу ў дні Вялікай Айчыннай вайны.

Гэта дакор не толькі тым таварышам, якія пішуць, шчыра намагаюцца штосьці зрабіць. Гэта дакор усім нам, гэта агульны наш недахоп, наш вялікі доўг Радзіме. У нас вельмі мала зроблена ў галіне ваенна-патрыятычнай літаратуры, у высока-мастацкім паказе вобраза Уладзіміра Ільіча Леніна, у сэнсе маральнага выхавання нашай змены. Наогул нам трэба, усім разам, усяму нашаму калектыву, саромецца таго, што наш маленькі і юны чытач даўно і вельмі цярпліва чакае ад нас добрых твораў.

Іх у нас мала не таму, вядома, што мы не хочам іх мець. Нават, здаецца мне, і не зусім таму, што добра пісаць для дзяцей—нялёгка. Я згодзен, што слабасць сучаснай літаратуры для дзяцей залежыць у многім і ад таго, што сёння і ўжо даволі даўно маўчаць М. Лынькоў, М. Танк, І. Шамякін, А. Вялюгін, І. Навуменка і іншыя паэты і празаікі, якія пісалі калісьці добрыя рэчы для дзетвары.

Мне хацелася б, аднак, праверыць на вас, таварышы, ці маю я рацыю, думаючы даволі часта, што шмат у каго з нас, «дарослых» пісьменнікаў, стаўленне да дзіцячай літаратуры, калі не проста пагардлівае, дык не зусім сур'ёзнае. Нягледзячы на той красамоўны прыклад, што найвялікшы, найдарослейшы пісьменнік нашай планеты з'яўляецца адначасна адным з найлепшых дзіцячых пісьменнікаў зноў жа ў сусветным маштабе. Я гавару пра Льва Талстога, які, як вядома, ганарыўся тым, што яго творы для дзяцей не толькі добрыя самі па сабе, але яны, праца над імі да таго ж яшчэ дапамагла яму напісаць усё «дарослае» той мовай, з той сілай і дакладнасцю, з якімі яно напісана. Прыгадаем таксама прыгожы прыклад Якуба Коласа—яго паэмы, вершы, казкі, апавяданні, яго «Другое чытанне для дзяцей-беларусаў», наогул яго стаўленне да вялікай справы стварэння беларускай дзіцячай літаратуры...

З гэтай трыбуны было ўжо кінута ў свой час нямала актуальных заклікаў і абяцанняў. Можна, вядома, заклікаць яшчэ раз: давайце, маўляў, дарагія таварышы, будзем больш і лепш пісаць для дзяцей!.. Прабачце, але ў гэтай справе хацелася б пачаць не з заклікаў: даволі часта нашы ўзаемныя заклікі даходзяць не далей пратакола, асядаючы ў ім да наступнай кампаніі. Лічу сваім абавязкам падкрэсліць з усёй адказнасцю і трывогай, што такое стаўленне да дзіцячай літаратуры, якое бытуе і развіваецца ў нашым асяроддзі,—справа ганебная і да дабра яна не давядзе. Сумна гэта. І небяспечна. Калі, вядома, думаць пра будучыню літаратуры. Не толькі дзіцячай, а ўсёй. Бо любоў да роднага, да мастацкага слова прывіваецца змалку. Не будзе гэтай любові—каму патрэбна будзе наша літаратура? Над гэтым варта задумацца.

На вышэй успомненых пасяджэннях у выдавецтве «Беларусь» і ў Камітэце па друку нашы таварышы, пісьменнікі, выказалі пэўныя заўвагі і прапановы, якія я лічу патрэбным паўтарыць, паставіць на абмеркаванне з мэтай як мага больш прычыніцца да паляпшэння справы выдання дзіцячай літаратуры.

Згаджаючыся з тым, што мала ў нас добрых дзіцячых кніг, гаварылі мы, што нейкім загадам або рашэннем іх, вядома, не створыш, трэба, аднак, не забывацца, што ў нас ёсць цудоўны дзіцячы фальклор, выдаваць і перавыдаваць які трэба ўсё больш і лепш. Робіцца ў гэтым сэнсе нямала, але і не залішне многа. Варта не забывацца таксама, што за нашае савецкае паўстагоддзе напісана ўсё-такі не так ужо і мала добрых рэчаў для дзяцей. Рэчы гэтыя трэба перавыдаваць значна шчадрэй, чым гэта рабілася дагэтуль. Разам з тым, трэба ўвесь час памятаць, што ёсць нямала выдатных і добрых твораў дзіцячай літаратуры ў братніх рэспубліках, твораў, якія трэба перакладаць і выдаваць рэгулярна. Ёсць таксама і цудоўны набытак усяго чалавецтва—сусветная дзіцячая класіка, якая можа рабіць, а можа яшчэ больш рабіць у сэнсе ўзбагачэння маральна-эстэтычнага свету нашых дзяцей. Давайце ўспомнім, якое значэнне ў жыцці кожнага з нас мелі і маюць рускі Талстой, француз П'еро, датчанін Андэрсен, амерыканец Твэн, як мы любілі іх, якое месца давалі ім у нашым дзіцячым светаўспрыманні. Давайце ўспомнім і другое—у нас усё яшчэ няма па-беларуску «Рабінзона Крузо», апавяданняў і аповесцей Светана-Томпана і Носава, казак Андэрсена і братоў Грым, аповесцей таго ж самага Твэна...

У нас ужо ёсць тым часам літаратары, якія могуць падаць нашым дзецям багацце сусветнай класікі ў добрых і выдатных перакладах. Прыгадаем да прыкладу, як натуральна гучаць па-нашаму Джані Радары ў перакладзе Язэпа Семяжона, Ян Бжэхва і Юльян Тувім у перакладах А. Вялюгіна і А. Зарыцкага, балгарская дзіцячая паэзія ў перакладзе Н. Гілевіча...

Перавыданне фальклору, лепшага з нашай дзіцячай літаратуры, пераклады здабыткаў савецкіх і сусветных дзіцячых літаратур,— гэта, безумоўна, не вырашае ўсёй справы, не вызваляе нас ад неабходнасці пісаць для дзяцей самім. Аднак жа ўсё гэта вельмі важна і актуальна, і мы лічым сваім абавязкам паставіць такое пытанне перад тымі ўдзельнікамі нашай нарады, ад якіх выдавецкія справы залежаць у большай ступені, чым ад нас, літаратараў.

Стварэнне кніг навукова-папулярнага жанру і тэматычных зборнікаў выдавецтваў трэба не толькі арганізоўваць, заказваць аўтарам, але ж і стымуляваць грашовымі авансамі. У нас ужо ёсць такія кнігі—хочацца ўспомніць добрым словам «Падарожжа ў краіну беларусаў» Віталія Вольскага і другое выданне «Слова аб роднай прыродзе», кнігі складзенай С. Грабчыкавым,— але ж кніг такіх і яшчэ лепшых у нас вельмі мала. Не ўсе, хто мог бы належным чынам пісаць або складаць такія кнігі, маюць магчымасць займацца гэтым не толькі на працягу гадоў, але нават і месяцаў, як гаворыцца па-народнаму, напавер, толькі спадзеючыся на ганарар. Эканомія дзяржаўных сродкаў—справа сур'ёзная, аднак і ў гэтай справе, калі думаць па-дзяржаўнаму, трэба ўлічыць усе факты. Ёсць каштоўнасці, якія не вымяраюцца ні на бухгалтарскіх лічыльніках, ні на ультрасучасных лічыльных машынах.

У гэтай жа сувязі ўжо не аднойчы гаварылася, што выдавецтва «Беларусь», у дадзеным выпадку яго рэдакцыя дзіцячай літаратуры, зусім дарэмна апошнім часам не карыстаецца ў належнай меры папярэднім рэцэнзіраваннем рукапісаў і рэдагаваннем іх сіламі вопытных літаратараў, ускладаючы гэта поўнасцю на рэдактараў штатных.

Трэба адкрыта сказаць, што рэдагаванне гэтае ў цэлым, за рэдкімі выключэннямі, і ў паэзіі (пра што я ўжо гаварыў), і ў прозе вядзецца не на належным ўзроўні. Справа перш за ўсё ў строгім, кваліфікаваным і прынцыповым адборы твораў, у бязлітасным адсейванні рэчаў слабых. І тут вось часамі прыкра заўважаюцца ўзаемныя паблажкі, узаемнае рэдагаванне кніг работнікамі выдавецтва, тымі таварышамі, што не толькі рэдагуюць, але і самі пішуць кнігі, і самі бываюць добранькімі, і для сябе патрабуюць таго ж.

Ад прыяцельскіх паблажак не застрахаваны, вядома, усе мы, у тым ліку і тыя таварышы, што рэдагуюць кнігі, не працуючы ў выдавецтве штатна, рэдактары і платныя, і тыя, што «на грамадскіх пачатках». І тут павінен быць адбор, і тут перш за ўсё павінна быць прынцыповасць.

Я ўпэўнены, што кола рэцэнзентаў і рэдактараў трэба рашуча і неадкладна пашыраць за кошт вопытных і аўтарытэтных літаратараў, —гэта бясспрэчна пойдзе справе на карысць. Бо многа, залішне многа ў нас кніжак для дзяцей, не толькі ў сэнсе літаратурнага стылю, але і самай звычайнай пісьменнасці рэдагуецца не на тым ўзроўні, які патрэбен як прыклад высокай культуры слова і нашым дзецям і нашым настаўнікам. Не нам гаварыць пра тое, колькі рублёў і капеек эканоміць на гэтым выдавецтва. Нам трэба сёння адкрыта сказаць і падкрэсліць, што ніжэй апускацца не варта: маральныя страты і так ужо вельмі вялікія, зашмат нашых дзіцячых кніг чытаеш з прыкрасцю, з болем, а то і зусім не можаш чытаць—з-за нуды і сумоты, якія не прыкрываюцца і найлепшым мастацкім афармленнем.

Дарэчы, два словы пра афармленне.

Мы запрасілі на наш сход групу вядомых мастакоў, актыўных афарміцеляў дзіцячых кніг. Перш за ўсё я хачу ад імя кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў шчыра, па-сяброўску прывітаць іх і падзякаваць за тую вялікую работу, якую яны натхнёна робяць, штогод то ўсё лепш афармляючы нашы дзіцячыя кнігі. Не будзем аднак утойваць ад нашых сяброў, што і яны не маюць права заспакойвацца на дасягнутым. І ў сэнсе мастацкага ўзроўню ілюстрацыі і вокладак, якімі не заўсёды задаволены, трэба думаць, і самі мастакі, і ў сэнсе беларускага каларыту малюнкаў, якога часамі, у належнай яго чысціні вельмі не хапае.

У нас ёсць два дзіцячыя часопісы: «Бярозка» і «Вясёлка». Я не стаўлю сабе за мэту рабіць агляд гэтых часопісаў, даваць ім поўную ацэнку: гэтым, магчыма, варта было б заняцца калі-небудзь асобна, таксама, як варта і трэба было б асобна заняцца справай падручнікаў, справай вывучэння роднай мовы ў школе. Хочацца сказаць адно: ёсць розныя думкі наконт таго, ці трэба нам ставіць пытанне пра павелічэнне «Бярозкі». Пра гэта ўжо гаварылася не аднойчы. Адны таварышы стаялі за павелічэнне, другія выказвалі трывогу, што не будзе, маўляў, чаго друкаваць. Прыкінуўшы, колькі добрай прозы магло быць надрукавана ў «Бярозцы», калі б яна была большая па лістажы, —успомнім вышэйназваныя творы А. Якімовіча, А. Васілевіч, І. Сяркова, надрукаваныя ў іншым месцы,— можна думаць, што друкаваць «Бярозцы» было б што. Трэба ўлічваць і тую акалічнасць, што большы памер часопіса будзе пэўным чынам стымуляваць з'яўленне патрэбных твораў. А ратаваць партфель рэдакцыі з поспехам можна перакладамі ўсесаюзнай і замежнай дзіцячай літаратуры. Словам, пытанне пра павелічэнне «Бярозкі» нам, Саюзу пісьменнікаў і Цэнтральнаму Камітэту камсамола, ставіць варта і трэба.

У заключэнне—пра справы, так сказаць, празаічныя.

Сапраўдны пісьменнік піша перш за ўсё таму, што не пісаць ён не можа. Прызнаючы гэта як першааснову, варта таксама падумаць пра тое, якую ролю ў стварэнні патрэбных кніг іграе заахвочванне. Не толькі добразычлівая, справядлівая крытыка і ўдзячнасць чытача пасля таго, як твор з'явіўся ў друку, але і тое, што можа дапамагчы пісьменніку трохі раней, спакусіўшы яго, грэшнага, на стварэнне новай рэчы. Хочацца падтрымаць ідэю конкурсаў і прэмій ва ўсёй іх разнавіднасці.

Прыклад І. Сяркова з яго цікавай і патрэбнай кнігай «Мы з Санькам у тыле ворага» добра гаворыць пра тое, што конкурсы, пры ўсіх накладных выдатках, даюць і станоўчыя вынікі. Конкурсы трэба праводзіць рэгулярна, калі не штогадова, дык раз у два гады.

Варта падумаць таксама пра ўстанаўленне штогадовай прэміі за лепшы твор дзіцячай літаратуры, скажам, прэміі Міністэрства асветы. Разам з тым трэба сур'ёзна ставіць пытанне, каб палажэнне аб Дзяржаўных прэміях БССР прадугледжвала ў спецыяльным раздзеле прысуджэнне прэміі за творы дзіцячай літаратуры. Побач з прэміямі—Купалаўскай за паэзію і драматургію, Коласаўскай за прозу і крытыку, Дзяржаўная прэмія БССР за лепшы твор дзіцячай літаратуры, прэмія, якая можа насіць імя роданачальніка гэтай літаратуры, Якуба Коласа,— гэта будзе вельмі законна і вельмі прыгожа. Скептыкам можна напомніць, што ўжо і сёння можна назваць адну-дзве кандыдатуры, вартыя гэтай прэміі. Трэба ўлічыць таксама і тую акалічнасць, што ўстанаўленне такой прэміі прынясе і пэўную актывізацыю ў дзіцячай літаратуры, паспрыяе большай павазе да гэтага недаравальна занядбанага жанру.

ПЛЁНУ І СПОРУ ТАБЕ, ДРУЖА!

РЫГОРУ ШКРАБУ — 50 ГАДОЎ

Вядомаму беларускаму крытыку Рыгору Шкрабу споўнілася пяцьдзесят гадоў. З гэтай нагоды праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі накіравала юбіляру прывітанне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Рыгор Васільевіч!

Сардэчна віншуем Вас, таленавітага крытыка і літаратуразнаўцу, са слаўным пяцідзесяцігоддзем.

За шмат год працы ў беларускай літаратуры Вы праявілі сябе прынцыповым прадстаўніком крытычнай думкі, глыбокім знаўцам і даследчыкам мовы і вобразаў не толькі класікаў нашай літаратуры— Янкі Купалы, Кузьмы Чорнага, Максіма Багдановіча, але і сучасных вядомых пісьменнікаў. Вашы работы па гісторыі і тэорыі літаратуры, Вашы кнігі «Сіла слова», «Характар, стыль, дэталь» сталі каштоўнымі дапаможнікамі для настаўніцтва і карыстаюцца вядомасцю ў шырокага чытача.

Жадаем Вам, Рыгор Васільевіч, добрага здароўя, асабістага шчасця і творчага натхнення».

Рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва», далучаючыся да гэтага прывітання, таксама жадае юбіляру доўгіх гадоў жыцця, здароўя, новых творчых поспехаў.

Што ні кажы, а Случчына мае сваю адметную красу. Здаўна гэты кут беларускай зямлі вызначаўся маляўнічымі краявідамі, славіўся ўраджаямі збажыны і садавіны, а таксама працавітымі рукамі бондараў і ткачоў, ганчароў і гарбароў. І яшчэ — тут вельмі сакаўная, звонкая і пявучая жывая мова народа. На Случчыне прыгожа спяваюць, умела расказваюць цікавыя казкі. Нездарма ж менавіта тут Сержпутоўскі зрабіў шмат цікавых запісаў ад мясцовых таленавітых казачнікаў.

Слуцкая зямля — радзіма Цішкі Гартнага і Кузьмы Чорнага, Алеся Гурло і Уладзіміра Жылкі, Рыгора Мурашкі і Аркадзя Чарнышэвіча, а таксама Максіма Лужаніна і Янкі Скрыгана, Міколы Хведаровіча і Адама Русака, Васіля Віткі і Міколы Лобана, Аляксея Кулакоўскага і Алены Васілевіч...

У гэтым краі казачнікаў і паэтаў нарадзіўся 17 сакавіка 1919 года і вядомы беларускі крытык, мой добры сябра і зямляк Рыгор Васільевіч Шкраба. Недалёка ад шахцёрскага Салігорска, там, дзе Случчына непрыкметна ўпісваецца ў палескія краявіды, знаходзяцца яго родныя Краснадворцы. Там Рыгор пражыў дваццаць год, і, як сам прызнаецца, «на ўсё жыццё застаўся вясковым чалавекам». Вакол было такое хараство: «Вясна гула снегавымі водамі. Лета агучана на плёнцы памяці грымотамі і дажджамі, восень — стукатам яблык у садзе, зіма — завываннем ветру ў коміне, песнямі дзяўчат на вячорках, гупаннем набіліц у кроснах і шорханнем палазоў па снезе».

Разам з адчуваннем і разуменнем прыгожага прыйшла замілаванасць да роднага слова, літаратуры, увага да жыцця і людзей. Тады ж пачалася вялікая і моцная — на ўсё жыццё — дружба з кнігай. Першымі, што запалі ў душу, былі «Новая зямля» і «Сокі цаліны». Любоў да роднай літаратуры прывяла восенню 1939 года на беларускае аддзяленне філфака БДУ. Пачалася старанная вучоба, настойлівая праца над кнігай.

Гэту працу раптоўна спыніла вайна. Давялося расстацца з Мінскам. Ваенныя пуцявіны былі нялёгкімі і суровымі. Пешкі трапіў у Магілёў, потым цягніком — у Куйбышаў; вучобу прадоўжыў у Свярдлоўскім педінстытуце (па стане здароўя ў армію трапіць не давялося). Эвакуіраванаму студэнту, у якога не было ні грошай, ні зімовай вопраткі, прыйшлося неўзабаве пакінуць інстытут і настаўнічаць у далёкай уральскай вёсцы Слаба-Турынская. У 1943 годзе — Крычаў, у жніўні 1944 — зварот у Мінск, зноў вучоба ва універсітэце. Рыгор Шкраба працуе літкансультантам у «Звяздзе». Пасля — газета «Літаратура і мастацтва», дзе быў літработнікам, сакратаром, загадчыкам аддзела літаратуры.

Некалькі гадоў мне давялося працаваць у «ЛІМе» разам з Рыгорам Шкрабам. Скажу з уласнага назірання: Рыгор — журналіст вельмі аператыўны, сур'ёзны і працавіты. На маіх вачах, тут жа за рэдакцыйным сталом, з'яўляўся патрэбны артыкул, рэцэнзія, аператыўныя матэрыялы аб літаратурным жыцці рэспублікі. Тэрмінова трэба перадавы на літаратурную тэму ці рэдакцыйны водгук— праз дзень-два патрэбны матэрыял у рэдактара на стале. Не цураўся ён і самай чарнавой і няўдзячнай працы. Прынёс, скажам, аўтар рэцэнзію ці артыкул. Думкі ёсць, але выкладзены яны суха, нецікава, не па-газетнаму. Рыгор адразу бярэцца «абгаблёўваць»... Трэба перакласці — перакладае. А ўжо калі даць матэрыялу яркую, жывую і дасціпную назву, то майстар, якіх мала...

Хачу адзначыць яшчэ адну вельмі важную рысу — дасканалае веданне творчых інтарэсаў таго ці іншага аўтара. Рыгор Шкраба ўмее знаходзіць патрэбнага аўтара, падахвоціць, падказаць тэму, зацікавіць нейкай кнігай. Мастацкі густ у яго дасканалы, можна толькі пазайздросціць. Калі сказаў: «Пачытай, цікава», «Паглядзі, здорава напісана», дык я смела бяруся чытаць раман, апавяданне, артыкул, нарыс, бо ведаю, што гэта будзе сапраўды цікава і здорава... Яшчэ — не любіць шэрасці, прыземленасці, сухога і нуднага акадэмізму, кансерватызму думкі.

На маю думку, у часопісе «Полымя» за апошнія гады з'явілася шмат цікавых і змястоўных артыкулаў, прысвечаных сучаснаму стану беларускай літаратуры і яе гісторыі. Не будзе перабольшаннем, калі я скажу, што вялікая заслуга ў гэтым Р. Шкрабы—рэдактара аддзела крытыкі і літаратуразнаўства.

Рыгор Шкраба — аўтар кніг «Сіла слова» і «Характар, стыль, дэталь». Сёлета выходзіць яго новая кніга «Літаратура і мова». Гэтыя кнігі яскрава сведчаць, што ў беларускім літаратуразнаўстве ў яго ёсць свая дзялянка. Дзялянка цяжкая, мала яшчэ даследаваная і распрацаваная. Улюбёны ў жывое народнае слова, ён цікавіцца ў першую чаргу майстэрствам пісьменніка, яго мовай і стылем. У Р. Шкрабы свой погляд, свае назіранні, своё «адкрыццё» пісьменніка і вядомых твораў. Таму я з вялікай цікавасцю чытаю яго артыкулы, на першы погляд спакойныя і разважлівыя, а на самай справе заўсёды вельмі палемічныя. Вызначаюцца даследаванні Р. Шкрабы яшчэ і тым, што яны напісаны ярка, вобразна, па-мастацку.

Рыгор Шкраба — крытык вельмі патрабавальны. У яго кнігах я не знаходжу многіх артыкулаў, якія ў свой час друкаваліся ў цэнтральных і рэспубліканскіх газетах і часопісах. Перад тым, як трапіць у кнігу, многія з іх нанова перагледжаны, дапоўнены новымі назіраннямі і думкамі.

Вялікая патрабавальнасць і грунтоўная тэарэтычная падрыхтоўка ў майго сябра спалучаецца з працавітасцю і любоўю да кнігі. Рыгор Шкраба — адданы кнігалюб, але кніга ніколі не засланяла яму бурлівага штодзённага жыцця. Ён часты госць на радзіме, ведае старобінскія навіны, перапісваецца з землякамі...

І надалей — спору і плёну табе, дружа!

Сцяпан АЛЕКСАНДРОВІЧ.

ХЛЕБ І ВЕРШЫ

Б. РАМАНАЎ

Кожнаму —
воля —
раздолле
цяпер.
Прыйдзе
з поля
напіша
верш...

Мы сядзім з Іванам Пятровічам Стукам у яго прасторным, утульным доме, чытаем цудоўныя радкі цудоўнага паэта, якія так і свецяцца добрай, прыязнай усмешкай. Мой субяседнік — брыгадзір комплекснай брыгады саўгаса — *захапляецца, бы дзіця.*

— Іван Пятровіч, а цяпер штонебудзь сваё, з новых вершаў.

Брыгадзір-паэт сарамліва адмаўляецца:

— Не ведаю, мо зарана? Хай бы лепш выспелі...

Сарамлівасць гэтая — непадробная, сціпласць — шчырая. Як і захапленне паэзіяй.

Голас у Івана Пятровіча глухаваты:

Я рэчку Крывую пытаю:
«Скажы мне, чаму ты
Крывая?
Чаму напрасткі не цячэш ты?
Дарога была б карацейшай».
І мне адказала Крывая:
«Я ў кожным куточку бываю
Любімага, роднага краю,
Палі і сады аглядаю,
У росныя травы ныраю
Ды чыстай вадой паліваю.
Калі ж міма сёл прабягаю,
Я радасць людскую вітаю,
Я песні аб шчасці збіраю...
Дарог не хачу карацейшых,
Цяку па шляхах
шчаслівейшых.

Слухаць брыгадзіра-паэта цікава. Паэтычная інтанацыя яго вершаў — без стылізацыі і падробкі «пад вядомых», багатая свежымі вобразамі. Крануў мяне верш Стука пра лён — красу і славу роднай Талачыншчыны:

...А вось лёну... Прайдзіся, як
лён зацвіце.
Такой дзіўнай красы ты не
ўбачыш нідзе:
Гарызонту няма, ты па небе
ідзеш.
Зараз сонца дагоніш і
промень кранеш!

Просячы прабачэння, Іван Пятровіч гаворыць:

— Мне трэба на брыгаду. Справы... Вы, калі ласка, пачытайце тут што-небудзь, я хутка вярнуся.

Так, справы. У тых, хто росціць хлеб, іх заўсёды хапае, у любую пару. А брыгадзір Іван Стук песціць важкі колас на родных гонях вось ужо трыццаць гадоў. Сын селяніна, ён і сябе аддаў земляробскай справе. Адсюль, з роднага Межыёва, пасля заканчэння сямігодкі паехаў вучыцца ў Віцебскі сельскагаспадарчы тэхнікум. Пасля выпуску ў 1938 годзе працаваў аграномам на Любаншчыне, у краі, апетым Купалам. Удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне. Апошнія трынаццаць гадоў нязменна працуе брыгадзірам у саўгасе «Рассвет», у родным Межыёве.

...Пацiху рыпяць дзверы, зноў заходзіць у пакой Стук.

— Я, здаецца, нядоўга?

І мы зноў сядзім з ім, гамонім пра вершы і хлеб. Зноў Іван Пятровіч чытае:

Хоць невялічкая, — чэснае
слова,
Слаўная вёска мая
Межыёва!—
Дзіўная назва крыху ў маёй
вёскі
Гэта мінуўшчыны злой
адгалоскі.
Межы былі тут калісьці,
палоскі...

Мне давялося чуць гэты верш і са сцэны саўгаснага клуба. І не толькі гэты верш. Самадзейны паэт піша і частушкі на мясцовыя тэмы. А яго вершаваныя фельетоны, у якіх трапна высмейваліся бракаробы, бюракраты, абібокі, прымушалі смяяцца нават самых хмурых буркатуноў.

Свой першы верш «Зіма» Іван Пятровіч надрукаваў у 1938 годзе ў «Чырвонай змене». Але больш у рэспубліканскія газеты не дасылаў. Патрабавальны да паэтычнага слова, да сябе ён быў і застаўся зусім бязлітасным.

У доме брыгадзіра першае, што адразу кідаецца ў вочы, — кнігі. Купала і Колас, Броўка і Глебка, Русак і Агняцвет, Барадулін і Лось, беларускія «Дні паэзіі». Рускія паэты — Блок, Бунін, Дрожжын, Сурыкаў, Кальцоў, Нікіцін, і вядома ж — Маякоўскі. Наогул, паэзіі — больш за ўсё. Нямала і палітычнай літаратуры, сельскагаспадарчых даведнікаў і дапаможнікаў, газет і часопісаў. І старыя, і малыя ідуць у дом свайго брыгадзіра, як у бібліятэку, і ім ніхто ніколі не адмаўляе. Бо як жа інакш?

— Кніжнікаў у нашым Межыёве нямала, — цёпла ўсміхаецца брыгадзір, — вунь Пётр Ісакавіч Стук — свая бібліятэка тамоў на дзвесце. Шчыпачова вельмі любіць. І сам, Пётр Ісакавіч спрабуе пісаць. Ці паказваў, пытаеце, свае вершы? Было такое...

Потым брыгадзір чытае:

Добрай раніцы, ніва.
Добрай раніцы, ніва шырокая.
Я—Іван, брыгадзір, я —
твой сейбіт.
Прабудзіся: вясна сонцавокая
Ужо расплёскала песні і
шчэбет...

«Размова з нівай» — так назваў гэты свой верш Іван Пятровіч. Цудоўная размова! Трыццацігадовы дыялог хлебароба-паэта з зямлёй-карміцелькай...

Нядаўна Іван Пятровіч адзначыў сваё пяцідзесяцігоддзе. І хочацца пажадаць яму вечнай маладосці сэрца і зайздроснай вернасці дзвюм цудоўным рэчам на зямлі—хлебу і вершам.

Талачынскі раён.

© PDF: Kamunikat.org 2023 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

© PDF: Kamunikat.org 2023 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

МАГУТНЫ ТАЛЕНТ

125 гадоў з дня нараджэння выдатнага рускага кампазітара Мікалая Рымскага-Корсакава

Гэтая музычная падзея адбылася ў Пецярбургу больш як сто гадоў назад. Афіша ля ўваходу ў гарадскую думу паведамляла, што 19 снежня 1865 года ў дзве гадзіны апоўдні ў зале пецярбургскай гарадской думы адбудзецца канцэрт бясплатнай музычнай школы пад кіраўніцтвам Мілія Балакірава. У першы раз будзе выканана сімфонія Мікалая Рымскага-Корсакава.

Імя кампазітара тады яшчэ нікому не было вядома.

«Публіка слухала сімфонію з усё большай цікавасцю і пасля андантэ і фіналу пачала выклікаць аўтара. І калі на эстрадзе з'явіўся аўтар, афіцэр марской службы, юнак гадоў дваццаці двух, усе, хто спачуваў маладосці, таленту, мастацтву... усталі як адзін чалавек! І гучнае аднадушнае віншаванне пачынаючаму кампазітару напоўніла залу гарадской думы!»

Так пісаў тады ў адной з пецярбургскіх газет кампазітар Цэзар Кюі аб вялікім поспеху першай сімфоніі маладога Мікалая Рымскага-Корсакава, якому прадказваў вялікую будучыню...

Імя Мікалая Рымскага-Корсакава сапраўды стала славутым і папулярным не толькі ў Расіі. Пятнаццаць опер, сімфанічныя, харавыя і камерна-інструментальныя творы, больш за семдзесят рамансаў — такая вялікая творчая спадчына, якую пакінуў Рымскі-Корсакаў рускай і сусветнай музычнай культуры.

Хто з нас яшчэ ў дзіцячыя гады не быў запалонены яго цудоўнай «Казкай пра цара Салтана»? А калі мы пасталелі, дык перад намі раскрыліся жамчужыны opернай творчасці Рымскага-Корсакава: яго чароўны былінны «Садко», юная і светлая «Снягурачка», летуценна-лірычная «Майская ноч», фантастычная «Ноч перад калядамі», сатырычны «Залаты пеўнік»...

Аб размаху і шматграннасці творчасці магутнага кампазітара сведчаць і яго насычаныя вялікім драматызмам гісторыка-бытавыя оперы «Царская нявеста» і «Пскавіцянка», а таксама рэвалюцыйная па музычным змесце асенняя казачка «Кашчэй Бессмяротны», і, нарэшце, яго цудоўная опера-легенда «Паданне аб нябачным горадзе Кіцежы і дзеве Фяўроніі»

Сімфанічную творчасць кампазітара вянчаюць такія жамчужыны, як казачная «Шахеразада» і паэтычная музычная аповесць «Іспанскае капрычыо»...

Мікалай Рымскі-Корсакаў дарагі нам тым, што ён у сваіх творах эпічнай мовай музыкі ярка адлюстроўвае характэрныя нацыянальныя рысы, асаблівасці жыцця, побыту рускага народа. Арыгінальнасць, своеасаблівасць яго творчасці ў тым, што бытавы каларыт у ім вынаходліва спалучаецца з народным эпасам.

Кампазітар—вялікі знаўца вакальнага мастацтва, ён выдатна вывучыў спецыфіку галасоў. Таму такія глыбокія і выразныя яго арыі, дуэты, ансамблі ў опернай і камернай творчасці. Кожны з нас, вакалістаў, мае вялікую эстэтычную асалоду ад натхнёнай музыкі Рымскага-Корсакава. Мне на працягу многіх гадоў працы ў Вялікім тэатры давялося спяваць у большасці оперных спектакляў вялікага рускага кампазітара. Эпічныя оперы Рымскага-Корсакава сцвярджаюць ідэю Радзімы, выхоўваюць у людзях патрыятызм, пранікаюць у свядомасць народа і таму сталі блізкімі і зразумелымі...

Мікалай Рымскі-Корсакаў належаў да групы выдатных рускіх кампазітараў, якую В. Стасаў назваў «магутнай кучкай». «Знаёмства з Балакіравым і яго гуртком, — пісаў М. Рымскі-Корсакаў у 1861 годзе, — вызначыла маю далейшую дзейнасць і схіліла да больш сур'ёзных заняткаў...»

Асабліва значная дружба Рымскага-Корсакава з Мусаргскім і Барадзіным. Пасля заўчаснай смерці гэтых двух выдатных кампазітараў Рымскі-Корсакаў рэдагаваў, закончыў і выдаў «Барыса Гадунова» і «Хаваншчыну» Мусаргскага, а ў садружнасці з кампазітарам Глазуновым — і «Князя Ігара» Барадзіна. Да гэтага часу «Барыс Гадуноў» і «Хаваншчына» Мусаргскага ідуць на сцэнах Вялікага і многіх іншых оперных тэатраў нашай краіны ў рэдакцыі Рымскага-Корсакава.

Рымскі-Корсакаў многа гадоў узначальваў Пецярбургскую кансерваторыю — гэта першая ў Расіі вышэйшая музычная навучальная ўстанова — вёў у ёй вялікую педагагічную работу. У ліку выхаванцаў Рымскага-Корсакава — А. Глазуноў, А. Лядаў, А. Арэнскі, Б. Асаф'еў, М. Гнесін, М. Баланчывадзе, М. Іпалітаў-Іванаў, Н. Мяскоўскі, С. Пракоф'еў, А. Спендзіяраў, М. Стравінскі і многія іншыя. Цяпер Ленінградская кансерваторыя носіць імя М. А. Рымскага-Корсакава.

Вялікай любоўю і ўсенародным прызнаннем карыстаецца творчасць вялікага рускага кампазітара, які далучае людзей да свету цудоўнага і прыносіць слухачам высокую эстэтычную асалоду.

Аляксей ІВАНОЎ,
народны артыст СССР.
(АДН).

Па той бок

ГРОШЫ СВЯТОГА ПРАСТОЛА

Больш як шэсць гадоў цягнулася спрэчка паміж урадам Італіі і Ватыканам. Спрачаліся аб тым, каб каталіцкая царква, цэнтр якой — Ватыкан знаходзіцца ў сталіцы Італіі Рыме на становішчы суверэннай феадальна-царкоўнай дзяржавы (такі статут быў вызначаны ў 1929 годзе на падставе так званага Латэранскага дагавору паміж тагачасным папам рымскім і Мусаліні), плаціла падаходныя падаткі ў італьянскую скарбонку.

Пасляваенная Італія ўвесь час у цяжкім фінансавым становішчы. Бо львіную частку бюджэту паглынаюць выдаткі, звязаныя з членствам у НАТА і гонкаю ўзбраення. Адзінае, што можа неяк выратаваць — гэта абкласці падаткам Ватыкан.

Як вядома, у Ватыкане толькі тысяча чалавек насельніцтва і 44 гектары зямлі. У параўнанні з ёю нават такія карлікавыя дзяржавы, як Ліхтэнштэйн або Сан-Марына, здаюцца велізарнымі. Але калі пaглядзець на фінансавы патэнцыял, дык карціна будзе супрацьлеглай. Мы не адважваемся параўноўваць багацці Ватыкана нават з англійскімі: досыць прыгадаць, што ён валодае рознымі акцыямі на суму ў 5 мільярдаў долараў, а англійскі ўрад яшчэ да сучаснага жорсткага фінансавага крызісу і дэвальвацыі фунта стэрлінгаў меў такіх акцый у два разы менш.

Латэранскі дагавор 1929 года быў патрэбен Мусаліні для таго, каб аўтарытэтам папы рымскага падтрымаць прэстыж свайго фашысцкага рэжыму. За гэта варта было заплаціць, і папы адзін за адным, у абмен на фінансавыя ільготы, бласлаўлялі разбойніцкую ўнутраную палітыку чорнарубашачнікаў, віталі захоп Абісініі, спрыялі саюзу Гітлера і Мусаліні.

А вось цяпер, насуперак Латэранскаму пагадненню, італьянскія фінансісты патрабуюць ад папы выплаты падаходнага падатку ў суме каля 12 мільёнаў долараў у год. Магчыма, сучасны ўрад Італіі і сам не супраць таго, каб Ватыкан так маліўся за яго і так яго выхваляў, як хваліў у свой час фашысцкага дыктатара—ды грошай на такую раскошу проста не хапае. І хочаш не хочаш, а давялося ісці на канфлікт.

Справа гэта не такая лёгкая яшчэ і таму, што сапраўдныя прыбыткі Ватыкана трымаюцца ў строгай тайне.

«Прыбыткі царквы ,— пісаў не так даўно ватыканскі афіцыёз «Оссерваторе романо», — ідуць ад народа, які прыносіць іх пакорліва і шчодра. І калі папа зберагае тыя прыбыткі, дык ён робіць гэта не для сябе, і ўжо напэўна не для грашовага пабору ці прыватных спекуляцый...»

Што прыбыткі каталіцкай царквы ў пэўнай меры ідуць непасрэдна ад народа, гэта бяспрэчна. Калі каму даводзілася пабываць, напрыклад, у Неапалі ў час штогадовага гарадскога рэлігійнага свята, ён мог быць сведкам даволі своеасаблівай карціны: па вуліцах пад гукі духавога аркестра крочыць пышная працэсія. Наперадзе нясуць статую святога шэфа гэтага горада. Тут жа ідуць манахі са скарбонкамі. Яны падбягаюць да ўдзельнікаў працэсіі, да людзей на тратуарах і трасуць у іх перад носам скарбонкаю. Манеткі бразгацяць, і людзі лезуць у кішэні па дробныя грошы. Гэта — так званы «грош святога Пятра». Разлік правільны: адзін грош — гэта нішто, а мільён — гэта ўжо нешта...

Шмат хто з заможных вернуючых падбягае да статуі і чапляе на яе банкнот. Калі працэсія даходзіць да сабора, дык святога за асігнацыямі ўжо і не відаць. Нарэшце статую ўносяць у царкву і ставяць на ганаровае месца. Тут на яе навешваюць другі і трэці пласт банкнотаў. Калі гэтая працэдура заканчваецца, свяшчэннік падыходзіць да статуі святога, артыстычным жэстам фокусніка здымае з яго грошы і нясе іх у сакрысцію, трымаючы на выцягнутых руках, далей ад сваёй кішэні: маўляў, гэта божы дар. Невядома ці прыліпае што-небудзь да яго сутаны, але што сабраныя мільёны павялічваюць багацці Ватыкана, — гэта зразумела кожнаму.

У самой Італіі захоўваецца не больш як дзесяць працэнтаў папскіх капіталаў. Прычыны на гэта дзве: па-першае, грошы трэба ўкладваць у найвыгаднейшыя прадпрыемствы, па-другое, Латэранскі дагавор застаецца дагаворам, а на ўсякі выпадак спакайней размясціць царкоўныя багацці ў некалькіх краінах. Ватыкан, напрыклад, з'яўляецца акцыянерам самай буйнай французскай фірмы «Пер'е», якая гандлюе мінеральнай вадою. Ватыкан валодае многімі небаскробамі ў Нью-Йорку. Пры чым вышыня гэтых будынкаў збянтэжыла нават такіх прававерных католікаў, як члены сям'і Кенедзі: яны паскардзіліся, што Ватыкан будуе небаскробы метраў на сорак вышэй, чым іх уласны так званы «культур-цэнтр» (амерыканскія мільянеры часам кідаюць сякую-такую суму на «культурныя патрэбы», — даволі прыгадаць вядомы «Ракфелер-цэнтр», які, дарэчы, прыносіць немалыя прыбыткі шчодраму мільярдэрству. Адказ Ватыкана на скаргі сям'і Кенедзі быў па-хрысціянску спакойны: мы вельмі шкадуем, што нашы будынкі вышэйшыя, але меншая колькасць паверхаў адбілася б на іх прыбытковасці!

Але толькі мінеральнай вадою і амерыканскімі небаскробамі папскія прадпрыемствы не абмяжоўваюцца. Ёсць у Італіі горад Сан-Рэма, а ў ім вядомае на ўвесь свет казіно — ігральнае прадпрыемства, якое сур'ёзна канкурыруе з не менш вядомым у Монтэ-Карла. Яно таксама належыць Ватыкану.

Папа рымскі мае акцыі італьянскіх транспартных кампаній, макаронных фабрык, млыноў і г. д. Ватыкан мае два свае банкі. Дырэктарам аднаго з іх,« Банко ды Рома», з'яўляецца сваяк нябожчыка папы Пія XII Пачэлі, вядомага саюзніка Гітлера і Мусаліні. Другі банк «Банко ды санто Спірыто», — «Банк святога Духу», і сама яго назва паказвае, што святы Дух нядрэнна клапоціцца пра сытасць Цела.

Ватыкан укладае таксама дзесяткі мільёнаў долараў у амерыканскі банк Моргана, дзесяткі мільёнаў фунтаў стэрлінгаў у англійскі банк «Гембро». Папа не супраць таго, каб змясціць мільёны швейцарскіх франкаў і ў «Крэйдзі Сюіс». І ўсюды гэтыя грошыкі не ляжаць без руху, а наадварот, дапамагаюць праводзіць розныя спекуляцыйныя аперацыі, дзякуючы якім нарастаюць працэнты.

З 1962 года ідзе зацятая барацьба паміж бязбожнымі італьянскімі падатковымі інспектарамі і святымі бессярэбранікамі з Ватыкана. Урадавыя фінансісты зыходзяць з таго, што Ватыкан павінен плаціць падаткі, бо іншаземны ўладальнік павінен дзяліць свае прыбыткі з дзяржавай, на зямлі якой размешчана значная колькасць яго прадпрыемстваў. Адвакаты ж папы спасылаюцца на Латэранскі дагавор.

Канчаткова вырашыць гэтае пытанне павінен быў італьянскі парламент. Але раптам Ватыкан паведаміў, што згодзен плаціць падаткі з прыбыткаў ад свайго капіталу, хоць і лічыць гэта несправядлівым. Адначасова Ватыкан паведаміў, што будзе выплачваць падаткі толькі часткамі, бо не можа адразу дастаць такую вялікую суму грошай.

З украінскага часопіса «Всесвіт».

Госці Мінска.

СУСТРЭЧА ПРАЗ ЧАТЫРЫ ГАДЫ

Упершыню мінчане пазнаёміліся з заслужаным калектывам рэспублікі Дзяржаўным сімфанічным аркестрам Армянскай ССР у маі 1965. Госці пазнаёмілі нас тады з цікавымі навінкамі — сімфоніямі Э. Мірзаяна і А. Аруцюняна і Віяланчэльным канцэртам А. Бабаджаняна.

І вось новая сустрэча праз чатыры гады — аркестр з Ерэвана іграе ў зале філармоніі ў Мінску. Узначальвае калектыў малады дырыжор Рубэн Вартанян, выхаванец Маскоўскай кансерваторыі, дзе ён займаўся ў аспірантуры па класе М. Аносава. Пасля малады музыкант стажыраваўся ў Венскім оперным тэатры і ў Венскім сімфанічным аркестры пад кіраўніцтвам аднаго з буйнейшых сучасных дырыжораў — Герберта фон Караяна. Тры гады Р. Вартанян быў асістэнтам у К. Кандрашына ў сімфанічным аркестры Маскоўскай філармоніі.

У канцэрце, аб якім я пішу, дырыжор выступіў як удумлівы і сур'ёзны музыкант з добрым густам.

Праграма адкрылася Фартэпіянным канцэртам Арама Хачатурана. Мне давялося слухаць першае выкананне гэтага твора ў Маскве ў ліпені трыццаць сёмага года. І сам канцэрт, і тое, як яго сыграў Леў Аборын з аркестрам, выклікалі ў слухачоў (гэта запомнілася) сапраўдны энтузіязм. З таго часу гэты твор А. Хачатурана справядліва лічыцца адным з шэдэўраў армянскай савецкай музыкі, а яго трактоўка Л. Аборыным — эталонам выканання і ,здаецца, інакш іграць канцэрт нельга.

Музычнае выкананне, аднак, не мае канчатковых інтэрпрэтацый: кожны артыст можа — і павінен! — уносіць у гучанне твора нешта сваё, індывідуальнае. Заслужаны артыст Армянскай ССР, лаўрэат міжнародных конкурсаў Юрый Айрапецян здолеў гэта зрабіць. Яго выкананне канцэрта Хачатурана характэрнае і віртуознасцю, і імправізацыяй. Патэтыка і магутнасць галоўнай тэмы, свабодная імправізацыя другой часткі твора, віртуозны бляск фінала — усё гэта знайшлося ў палітры музыканта, які выконваў канцэрт упэўнена і лёгка. Надзвычай добрым быў ансамбль саліста і аркестра, які ствараў дырыжор. Аркестр не акампаніраваў, а як бы выконваў сімфонію для аркестра і саліруючага фартэпіяна.

Дзмітрый Шастаковіч. Дзевятая сімфонія... Мы яшчэ помнім спрэчкі аб гэтым творы. У год Перамогі Д. Шастаковіч стварыў сімфонію-мініяцюру, светлая, бурлівая музыка якой прасякнута гумарам і, разам з тым, мае сапраўды драматычныя, а часам нават і сурова-жалобныя старонкі. Пяць частак сімфоніі рэзка кантрастуюць і вымагаюць ад дырыжора ўмення дакладна размяркоўваць фарбы і дынаміку кожнай часткі ў агульным гучанні. На маю думку, Р. Вартанян асабліва тонка перадаў якраз драматычныя старонкі сімфоніі — другую і чацвёртую. Жалобны рэчытатыў-маналог фагота з чацвёртай часткі, з гэтага непаўторнага «жалобна-трыумфальнага інтэрмецца», праніклёна выканаў Г. Гамбаран. Што ж датычыць агульнага ўражання, дык трэба сказаць, што музыка Шастаковіча, відаць, наогул вельмі блізкая артыстычнай натуры дырыжора.

Сімфанічны фрагмент «Вандраванне Зігфрыда па Рэйне» з музычнай драмы Р. Вагнера «Скон багоў» таксама быў увасоблены аркестрам і дырыжорам вельмі рэльефна, вобразна.

Адчуваецца, што калектыў у добрай творчай форме — паранейшаму ў аркестры выдатная струнная група, якую ўзначальвае канцэртмайстар першых скрыпак Ю. Пагасян. Драўляныя і медныя духавыя паказалі сябе на гэты раз значна лепш, чым чатыры гады назад. Напрыклад, як тактоўна выконваў сольныя фразы ў першай частцы Фартэпіяннага канцэрта Хачатурана малады габаіст Л. Аганян! Уражанне было такое, быццам у артыста не габой, а цудоўны армянскі народны інструмент — зурна, тэмбр якой вельмі стасуецца да гэтага эпізода твора.

Шкада, што калектыў на гэты раз не выконваў новыя творы армянскіх кампазітараў. У гутарцы з Р. Вартанянам я даведаўся, што ў рэпертуары аркестра ёсць, напрыклад, сімфонія К. Арбляяна і Канцэрт для трубы з аркестрам А. Аруцюняна. Ды і армянская музычная класіка выконваецца ў нас надзвычай рэдка — чаму б не паказаць узоры яе ў часе гастроляў? «На біс» аркестр, скажам, з вялікім поспехам сыграў «Эрыванскія эцюды» А. Спендзіярава. Другім творам, які выконваўся ў адказ на апладысменты, стаў... «Сумны вальс» Сібеліуса. Надзея залы пачуць музыку краіны Севана, на жаль, не здзейснілася.

Дзяржаўны аркестр Армянскай ССР цяпер у вялікай гастрольнай паездцы. Дырыжор і артысты выказвалі сваё сапраўднае задавальненне тым, як праходзіў, напрыклад, канцэрт у Гомелі — зала музычнага вучылішча была перапоўнена ўважлівымі і ўдзячнымі слухачамі. На жаль, гэтага нельга сказаць пра канцэрт у Мінску — тут гледачы таксама былі ўважлівыя і ўдзячныя, але ж іх было мала. Вінаваты ў гэтым, мабыць, і тыя, хто адказвае за рэкламу: не ўсе аматары музыкі нашай сталіцы ведалі пра прыезд гасцей.

Леў АЎЭРБАХ.

У ПРАГРАМЕ— ФЕРЭНЦ ЛІСТ

Кожны, каму здараецца зайсці ў пяты клас Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, міжволі спыняе свой погляд на вялікай фатаграфіі, якая ўпрыгожвае адну са сцен аўдыторыі. На ёй адлюстраваны адзін з момантаў урока выкладчыка сярэдняй спецыяльнай музычнай школы, цяпер дацэнта кансерваторыі Рыгора Ільіча Шаршэўскага з юным піяністам Эдуардам Міянсаравым.

З таго часу прайшло амаль дваццаць гадоў. Далёка ззаду засталася Мінская музычная школа-дзесяцігодка, гады вучобы ў Маскоўскай кансерваторыі і ў аспірантуры па класе прафесара Льва Мікалаевіча Аборына. Здабыткам мінулага сталі чацвёртая прэмія і званне лаўрэата Першага міжнароднага конкурсу імя П. І. Чайкоўскага.

Зараз Эдуард Міянсараў—саліст Масканцэрта. За гады, якія прайшлі пасля конкурсу імя П. І. Чайкоўскага, піяніст пабываў з канцэртамі амаль ва ўсіх кутках Савецкага Саюза. І ледзь не штогод у планы яго гастрольных паездак уключаецца Мінск — горад, які стаў родным для яго. Эдуард Арсенавіч часта папаўняе свае канцэртныя праграмы фартэпіяннымі творамі беларускіх кампазітараў — Л. Абеліёвіча, Я. Глебава, Д. Камінскага, Э. Тырманд і іншыя.

Канцэрт Эдуарда Міянсарава, які адбыўся 14 сакавіка г. г. у зале філармоніі, быў цалкам прысвечаны творчасці Ферэнца Ліста. Праграма канцэрта была складзена з вялікім уменнем і густам. Апрача трох рознахарактарных транскрыпцый Ф. Ліста, якія адкрывалі першае аддзяленне канцэрта (марш з оперы Р. Вагнера «Тангейзер», транскрыпцыя рамансa Р. Шумана «Пасвячэнне» і канцэртная апрацоўка мі-бемоль мажорнага капрыса Паганіні), у яго ўваходзілі такія віртуозныя творы, як «Прэлюдыя», канцэртны эцюд ля-мінор і гераіка-драматычны эцюд «Мазепа» з цыкла эцюдаў «Трансцэндэнтнага выканання» і віхравая, захапляючая сваім святочным бляскам «Іспанская рапсодыя». Сыграная ў канцы першага аддзялення саната «Пасля чытання Дантэ» адлюстроўвала ўжо не столькі віртуозныя, колькі праграмна-філасофскія тэндэнцыі ў творчасці Ліста. Два лірыка-драматычныя санеты Петраркі (104 і 123), эцюды «Пейзаж» і «Вячэрнія гармоніі» і тонкі, пяшчотна-летуценны накцюрн «Летуценні кахання» адкрывалі слухачам багатыя, сапраўды невычарпальныя магчымасці лістаўскай лірыкі. Праграму дапоўнілі выдатна сыграныя на «біс» дзве прэлюды Д. Шастаковіча (фа дыез-мажор і рэ бемоль-мажор) і марш з оперы С. Пракоф'ева «Любоў да трох апельсінаў».

У пачатку канцэрта піяніст іграў строга, проста, да некаторай ступені шчыра, але без належнага цяпла. без захаплення. Магчыма, таму ўсе тры фартэпіянныя транскрыпцыі так і не пакінулі ў слухачоў глыбокага ўражання, хоць ужо з самага пачатку можна было зрабіць вывад аб выдатнай школе, высокай выканаўчай культуры і яркім прафесіянальным майстэрстве канцэртанта.

Выкананне двух «Санетаў Петраркі», у адрозненне ад транскрыпцый, парадавала большай глыбінёй, праніклёнасцю і эмацыянальнай выразнасцю. Тут Эдуард Міянсараў паказаў сябе выдатным майстрам фартэпіяннага гукапісу. Піяніст тонка адчувае клавіятуру, добра ведае магчымасці свайго інструмента і выразна даносіць да слухача свае выканаўчыя намеры.

Такое ж майстэрства адчувалася ў інтэрпрэтацыі лірычных эпізодаў санаты «Пасля чытання Дантэ», эцюдаў «Пейзаж», «Вячэрнія гармоніі» і накцюрна «Летуценні кахання». Чуйнае ўслухоўванне ў падтэкст твораў, уменне знайсці для кожнага з іх свой адметны тон і эмацыянальны каларыт садзейнічалі ўзнікненню атмасферы інтымнага кантакту артыста з аўдыторыяй.

Не менш маляўніча і цікава былі сыграны віртуозныя творы, у якіх перш за ўсё хочацца адзначыць вялікую тэхнічную свабоду і поўнае падначаленне віртуозных сродкаў паэтычнай задуме. Праўда, тэхніка піяніста не заўсёды бывае дасканалай. У некаторых ажурных пасажах эцюда па Паганіні, напрыклад, хацелася б большай адточанасці і адухоўленасці, а ў сярэднім раздзеле таго ж эцюда і ў напружана-драматычных эпізодах санаты «Пасля прачытання Дантэ» — большай стыхійнасці і ўнутранай сілы. Аднак амаль такія ж карункавыя пасажы, якія ўпрыгожвалі музычную тканіну кантыленных п'ес і бурныя актаўна-акордавыя раздзелы эцюдаў ля-мінор і «Мазепа», пакаралі дакладнасцю і мастацкасцю выканання.

Сярод твораў віртуознага плана найбольш запомніліся эцюд «Мазепа» і «Іспанская рапсодыя». У «Мазепе» піяніст з поўнай сілай раскрывае ўнутраную канфліктнасць складанага гераіка-трагедыйнага вобраза. «Іспанская рапсодыя» таксама захапіла аўдыторыю яркасцю, артыстызмам і нейкай асаблівай святочнай узнёсласцю.

Канцэрт Эдуарда Міянсарава ўвогуле сведчыць аб тым, што піяніст з'яўляецца дастойным пераемнікам лепшых традыцый савецкай фартэпіяннай школы, у прыватнасці, школы Ігумнава—Аборына, для якой заўсёды былі характэрныя высокая піяністычная культура, майстэрскае валоданне гукам, цудоўная фразіроўка, поўнае падначаленне ўсіх выяўленчых сродкаў раскрыццю асноўнай мастацкай ідэі і аб'ектыўнае стаўленне да аўтарскага тэксту, якое, аднак, не абмяжоўвае выяўлення асабістай выканаўчай ролі.

Уладзімір КОКУШКІН.

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

Магілёўскі абласны драматычны тэатр паказаў прэм'еру вадэвіля «Саламяны капялюш» Э. Лябіша. Спектакль паставіў заслужаны дзеяч мастацтваў Марыйскай АССР Б. Валадарскі. Дэкарацыі зроблены па эскізах мастака М. Волахава. Музычнае афармленне Э. Катковіча. Танцы паставіў А. Касцінец.

На здымку, зробленым А. Голышам,—сцэна са спектакля. У ролі Фадзінара артыст Ю. Колчын, Клары—артыстка Р. Сакалова.

ГІСТОРЫЯ АДНАГО ПАРТРЭТА

У Амстэрдаме, у доме старога галандскага мастака-камуніста Петэра Алма, мне давялося ўбачыць выдатна выкананую літаграфію У. І. Леніна. Мастак намаляваў правадыра першай у свеце пралетарскай рэвалюцыі ў той момант, калі ён выступае з трыбуны перад дэлегатамі трэцяга кангрэсу Камінтэрна ў Маскве. Ленін імкнецца наперад, ён не проста гаворыць, ён пераконвае, кліча, указвае шлях...

Алма заўважыў, з якой увагай я разглядваю малюнак.

— У гэтай літаграфіі незвычайная гісторыя, — сказаў ён. — Незвычайная ўжо таму, што яна зроблена на падставе асабістых уражанняў. Так, не здзіўляйцеся. Улетку 1921 года я быў запрошаны ў якасці госця на трэці кангрэс Камінтэрна ў Маскву. Мне выпала шчасце бачыць і чуць Леніна. Такое не забываецца! Вярнуўшыся на радзіму, я, тады яшчэ малады ўдзельнік галандскага рабочага руху, стараўся чытаць усе працы Леніна, якія можна было дастаць, сачыў за кожным яго выступленнем...

У ветраны студзеньскі дзень 1924 года з Масквы прыйшла цяжкая і сумная вестка: памёр Ленін! Гэта вестка ўзрушыла Алму. «Я падумаў: зараз, калі правадыра ўжо няма, мой абавязак — захаваць для людзей яго вобраз, — успамінае мастак. — Усе іншыя работы былі адкладзены ўбок. У тую ж ноч я ўзяўся за аловак. Мне хацелася намаляваць Леніна такім, якім ён застаўся ў маёй памяці: палымяным прамоўцам, які ўвесь імкнецца наперад...»

Літаграфія У. І. Леніна, аб якой ідзе гаворка, публікавалася ў рабочай газеце «Трыбюн», на старонках іншых прагрэсіўных галандскіх выданняў. У гады вайны, калі Нідэрланды былі акупіраваны фашыстамі, Петэра Алму не раз выклікалі ў гестапа, а ў яго невялікім атэльe рабіліся старанныя вобыскі. Гітлераўцы шукалі літаграфію Леніна, але так і не змаглі яе знайсці. Мастак, рызыкуючы жыццём, захаваў гэтую дарагую для яго работу.

Зараз Петэру Алму больш як 70 гадоў. Не так даўно яму прысуджана прэмія імя Альбера Швейцэра «За служэнне сваім высокім майстэрствам чалавецтву і сацыяльнаму прагрэсу». За плячыма мастака — вялікае творчае жыццё, сотні работ. У іх ліку — цэлая серыя карцін, малюнкаў, літаграфій, прысвечаная працоўнай Галандыі: «Стачка», «Будаўнікі», «Беспрацоўныя на біржы працы» і іншыя. «Але літаграфія У. І. Леніна, зробленая суровай зімой 1924 года, па-ранейшаму самая памятная і дарагая для мяне», — гаворыць Алма.

Ю. КАРНІЛАЎ,
карэспандэнт ТАСС.
Гаага.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

18 сакавіка

Першая праграма. 9-10 — тэлебачанне — школе. Фізіка. 9-ы клас. «Вадзяная пара ў атмасферы». 9-40 — «Людзі з Нерэтвы». Кінанарыс. 10-00 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — тэлевізійнае агенцтва «Піянерыя». Перадача з Харкава. 10-45 — П. Качо. «Віцязь Янаш». Тэлевізійны музычны спектакль (М). 13-55 — праграма перадач. 14-00 — чэмпіянат свету па хакеі з шайбай. ЧССР — Фінляндыя. Перадача са Стакгольма. 17-00 — тэлевізійныя навіны (М). 17-15 — чалавек і прырода. «Мармур Каелгі». Кінанарыс. 17-30 — для дзяцей: «Зайка-зазнайка». Спектакль дзіцячай драматычнай студыі пры Палацы культуры прафсаюзаў БССР. 18-10 — «Панарама навін». 18-30 — ленінскі універсітэт мільёнаў. Палітэканомія сацыялізма. У. І. Ленін. «Дзяржава і рэвалюцыя». Перадача 2-я (М). 19-00 — чэмпіянат СССР па боксе. Перадача з Казані. У перапынку—тэлевізійныя навіны (М). 20-30 — А. Уайльд. «Партрэт Дарыяна Грэя». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Частка 1-я (М). 22-00 — чэмпіянат свету па хакеі з шайбай. СССР — Канада. Перадача са Стакгольма. У перапынках — тэлевізійныя навіны (М).

Другая праграма. 17-15 — «Народныя майстры прыкладнога мастацтва». Перадача з Кішынёва. 18-00 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Музычны церамок». Перадача з Пярмі. 18-30 —«Плыўцы даганяюць час». Напярэдадні міжнародных спаборніцтваў па плаванні на прыз газеты «Комсомольская правда». 19-15 — па роднай краіне. «Тры дні на Сахаліне». Кінанарыс. 19-45 — «Палата». Мастацкі фільм. 21-10 — экран—завочнікам. «Фізіка».

19 сакавіка

Першая праграма. 9-10 — тэлебачанне — школе. Біялогія. 10-ы клас. «Заканамернасці спадчыннасці». Перадача 1-я. 9-40 — «Другое жыццё». Кінанарыс. 10-00 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — А. Уайльд. «Партрэт Дарыяна Грэя». Тэлевізійны спектакль. Частка 1-я (М). 11-45—для школьнікаў. «На старце — свердлаўчане». Перадача са Свярдлоўска. 12-15—чэмпіянат свету па хакеі з шайбай. СССР—Канада. Перадача са Стакгольма (у запісе) (М). 16-15 —праграма перадач. 16-20 — для школьнікаў. С. Абразцоў. С. Праабражэнскі. «Вялікі Іван». Спектакль Калінінградскага тэатра лялек. 17-40 — «Панарама навін». 18-00— чэмпіянат свету па хакеі з шайбай. СССР—Фінляндыя. Перадача са Стакгольма. У перапынках — тэлевізійныя навіны (М). 20-15 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 20-30 — А. Уальд. «Партрэт Дарыяна Грэя». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Частка 2-я (М). 22-00 — чэмпіянат свету па хакеі з шайбай. ЧССР — Швецыя. Перадача са Стакгольма. У перапынках — тэлевізійныя навіны (М).

20 сакавіка

Першая праграма. 10-00 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — А. Уайльд. «Партрэт Дарыяна Грэя». Тэлевізійны спектакль. Частка 2-я (М). 11-25 — для школьнікаў. «У майстэрні мастака» (М). 11-55 — чэмпіянат свету па хакеі з шайбай. СССР—Фінляндыя. Перадача са Стакгольма. (у запісе) (М). 16-55 — праграма перадач. 17-00— тэлевізійныя навіны (М). 17-10 — «Бібліятэка беларускай паэзіі». В. Таўлай. «Выбранае». 17-40 — «Панарама навін». 18-00 — для школьнікаў. Канцэртная зала. «Арфей». Ф. Ліст. «Гады вандраванняў». 18-30 — праграма каляровага тэлебачання (М). 20-00 — «Па ленінскіх запаветах». «Для рабочага чалавека». Да 50-годдзя падпісання У. І. Леніным дэкрэта аб курортных мясцовасцях агульнадзяржаўнага значэння 20-30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-00 — чэмпіянат свету па хакеі з шайбай. Канада—ЗША. Перадача са Стакгольма. У перапынках — тэлевізійныя навіны (М). 23-15 — навіны. каментарыі. Праграма перадач. 23-30 — міжнародныя спаборніцтвы па плаванні на прыз газеты «Комсомольская правда» (у запісе).

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, Р. С. БЯРОЗКІН, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—3-25-25, адказнага сакратара—3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра кіно і музыкі—3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры, вытворчай эстэтыкі—3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».
Індэкс 63856. АТ 04133